Язэп Карпюк ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Уладзіслаў Завадскі ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 43 (2893) Год LVI | Беласток, 23 кастрычніка 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Тадэвуш Кунцэвіч — паэт з Лешукоў

— Першыя вершы пачаў я пісаць яшчэ ў падставовай школе ў Лешуках. Тады пад наглядам настаўніка Аляксея Харкевіча напісаў я словы на мелодыю частушак, з якімі мы мелі выступіць у час Багатага вечара, — прызнаўся Тадэвуш Кунцэвіч 6 кастрычніка ў час аўтарскага спаткання ў бібліятэцы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы.

Вядучая аўтарскі вечар бібліятэкарка Анжаліна Масальская ўдакладніла, што была гэта першая сустрэча, наладжаная ў бібліятэцы ў камерных абставінах, бо папярэднія ў рамках праекта „Кірыліцай пісанае" ладзіліся ў вялікай музейнай зале. На спатканне прыйшлі знаёмыя Кунцэвіча, яго настаўнік Аляксей Харкевіч, які пазней працаваў у Гайнаўскім белліцэі, а таксама аматары беларускага слова. Спачатку паэт сказаў, што яго творы невядомыя шырэйшай публіцы. Чыталіся яны толькі ў час мерапрыемстваў ладжаных у Нараўчанскай гміне і ніхто з „белавежцаў", апрача Міры Лукшы, з ім не кантактаваўся. Згадаў ён таксама вершы надрукаваныя ў „Ніве".

— Пасля спаткання ў школе ў Лешуках з Аляксандрам Баршчэўскім я пачаў інакш глядзець на беларускую паэзію і яшчэ ў падставовай школе стаў пісаць вершыкі па-беларуску. Сустрэча з беларускім паэтам мяне вельмі ўразіла, бо выводзіўся жа ён з недалёкіх ад нашай вёскі Бандароў і патрапіў дабіцца такіх поспехаў. Калі пазней настаўнік пахваліў мяне за дабраныя мною рыфмы, я стараўся пісаць яшчэ складней і лепш. У першых класах падставовай школы пачаў я пісаць на польскай мове, але такое пісанне не ляжала мне на сэрцы. Я тое, аб чым хачу напісаць, лепш адчуваю, калі раблю гэта па-беларуску, — сказаў у час сустрэчы Тадэвуш Кунцэвіч.

Першы верш, які паэт прачытаў перад сабранымі, быў прысвечаны Алесю Барскаму. Ляшуцкі паэт чытаў таксама вершы прысвечаныя жонцы і астатнім жанчынам, дэкламаваў рэфлексіўныя і жартоўныя вершы, а таксама творы сатырычнага характару. У Тадэвуша Кунцэвіча ёсць таксама аўтабіяграфічныя, філасофскія і прыродаапісальныя творы, вершыкі для дзяцей. Піша ён на беларускай літаратурнай мове, але часта карыстаецца нараўчанскім дыялектам. У адных вершах больш народнай гаворкі, у іншых — менш. У ходзе сустрэчы паэт чытаў вершы ўдала, з добрай дыкцыяй і правільным вымаўленнем. Дэкламуючы свае творы, ведаў жа на што ў іх звяртаць асаблівую ўвагу.

— Складней пісаць вершы пра сваіх людзей па-свойму. Калі я напішу верш, пасля толькі выпраўляю ў ім памылкі, але не стараюся перарабляць яго. Напісаны першы раз твор — найлепшы, бо пасля пераработак ён ужо не такі, — сказаў паэт і дадаў, што здаралася яму ў моладасці складаць словы на вядомыя мелодыі. Апошнім часам такім спосабам узнікла песня для ляўкоўскіх „Цаглінак", прымеркаваная да 35-годдзя іх дзейнасці. — Часам я пачынаю пісаць вершы з сярэдзіны або нават і з канца. Бывае, што я, рубаючы дровы, перарываю працу і іду нешта запісаць, бо цікавая ідэя прыйшла мне ў галаву. Калі іду за грыбамі, бяру з сабой паперу, аловак і таксама раблю перапынкі, сядаю на пянёк і стараюся пісаць вершыкі, хаця, канешне, пасля дома іх дапрацоўваю. Не пішу сваіх вершаў, калі толькі ёсць вольны час, бо дзеля гэтага патрэбныя натхненне і адпаведныя думкі.

Сабраныя цікавіліся паэтычнай актыўнасцю госця і даведаліся, што найбольш вершаў напісаў ён у апошніх гадах, калі было ў яго даволі многа вольнага часу.

— Вершаў сабралася ў мяне даволі многа. Два сшыткі запісаў, але ёсць і адзіночныя, на асобных лістках. Некаторыя з іх нават згубіліся. Добра было б сабраць вершы і выдаць. Спачатку хацеў бы я выдаць кніжку з вершамі, прымеркаванымі да чатырох пор года, — выявіў свае мары Тадэвуш Кунцэвіч. — Найлепш пішацца мне ў кухні і ноччу за папяроскай. Калі аб нечым хачу параіцца з жонкай, буджу яе і распытваю, а яна мне дапамагае. Маю Марысю я заўважыў яшчэ ў падставовай школе, а пазней ажаніўся з ёй і не шкадую свайго рашэння.

Тадэвуш Кунцэвіч, які нарадзіўся і зараз пражывае ў Лешуках, працуючы лесніком жыў таксама ў Масеве, Жэрчычах і Ялоўцы. Пазней працаваў настаўнікам, рабочым на Керамічным прадпрыемстве ў Ляўкове ды на будаўнічым прадпрыемстве, якое будавала Беларускі музей у Гайнаўцы.

— Калі я пішу вершы аб прыродзе, дык агульна, напрыклад, аб балотах, ці лясах і не складаю твораў дрэвам ці кветкам. Пішу таксама вершы на заказ, напрыклад, на Дзень настаўніка — аб настаўніках, на Дзень жанчын — аб працаўніцах пошты, банкаў ці бібліятэк. Перад напісаннем такіх твораў стараюся здабыць як найбольш інфармацыі аб канкрэтных асобах, якіх называю ў сваіх вершах па імені. Калі яны чуюць такія творы аб сабе, то адны з іх засмяюцца, а другія пачырванеюць. Бывала, што ў нашай гміне чытаў я свае вершы публічна. У Ляўкове адбылася сустрэча са мной і з Алегам Кабзаром. Ён спяваў тады аўтарскія песні, а я чытаў свае вершы, — расказваў Тадэвуш Кунцэвіч.

— Вершы Тадэвуша Кунцэвіча вельмі цікавыя і ён, як асоба, таксама вельмі цікавы чалавек, — сказала ў канцы сустрэчы бібліятэкарка Анжаліна Масальская і зрабіла заказ — напісаць верш, прысвечаны Беларускаму музею. Паэт згадзіўся.

Меню тэлевізара „Horizont”

Мой добры знаёмы купіў беларускі тэлевізар „Horizont”. Расійскамоўная назва беларускага прадукту выведзеная бліскучымі лацінскімі літарамі. Марка вядомая, моцна разрэкламаваная пад лозунгам „купляй сваё”. Ды і завод знакаміты. Перш за ўсё тым, што атрымаў вялікую падтрымку з дзяржаўнай казны пасля таго, як да ўлады прыйшлі тыя правячыя колы, якія ўладараць на Беларусі і зараз. У той час яны даводзілі айчынным абывацелям, што трэба захаваць сваю вытворчасць хоць якім коштам, бо менавіта гэта ўратуе незалежнасць краіны.

Праўда, ніхто так і не патлумачыў, што можна лічыць нашым, і як выглядае тая незалежнасць. Неяк так, нясмела, праскаквалі рэплікі, што дзеля беларускай незалежнасці патрэбен і саюз з Расіяй, і мытная прастора з Казахстанам, і вялікі ўраджай зерня, і яшчэ шэраг рэчаў, абсалютна не звязаных ні з беларускай мовай, ні з беларускасцю ўвогуле.

Крыху пазней для незалежнасці спатрэбілася шматвектарная палітыка, крэдыты з Захаду і разгром унутранай апазіцыі. А самае галоўнае — востра неабходнымі сталі змены ў заканадаўстве.

Зараз усе ломяць галовы пра тое, што пасля апошніх, прынятых ледзь не ва ўмовах звышсакрэтнасці заканадаўчых змен, беларускай апазіцыі прыйдзецца яшчэ цяжэй. Але навошта камусьці спатрэбілася зноў уносіць заканадаўчыя змены супраць апазіцыі? Гэта поўны абсурд. Таму што супраць апазіцыі дзеіць цэлая дзяржаўная машына, якая ўвогуле не патрабуе аніякай нарматыўнай базы. І прыкладам таму ёсць не толькі нядаўні арышт праваабаронцы Алеся Бяляцкага, не толькі паслявыбарчыя суды над былымі кандыдатамі на першую пасаду ў краіне і іх паплечнікамі, але і вызваленне многіх з іх з-за кратаў па чыейсьці добрай волі ці нядобрай неабходнасці.

Можна арыштаваць, можна вызваліць, і дзяржаўны механізм спрацуе. Ён не просіць аніякіх змен у заканадаўства. Дык навошта ж яны спатрэбіліся? Хіба для той апазіцыі, якая чыста тэарэтычна можа з'явіцца ў структурах самой улады. Але і тут пытанне, для якой з іх. Для той, якая захоча аддаць незалежнасць, ці для той, якая захоча яе захаваць хоць такую, якая ёсць.

Робяцца тыя змены ў заканадаўства не абы-калі, а дакладна ў той час, калі рэальны кіраўнік усходняй суседняй дзяржавы, і тэарэтык паглынання Беларусі Расіяй цалкам або часткамі, які насіў калісьці тытул прэзідэнта, заявіў што зноў хоча яго панасіць. А цяперашні носьбіт гэтага тытулу спрачацца не стаў.

І на Украіне цікавыя працэсы распачаліся. Там былая прэм'ерша і галоўная канкурэнтка дзеючага ўкраінскага прэзідэнта Юлія Цімашэнка дастала сем гадоў астрогу. А сённяшняе кіраўніцтва Украіны, пакуль незалежніца Цімашэнка за кратамі, упершыню загаварыла пра ўмовы, на якіх яна магла б увайсці ў агульную мытную прастору з братнімі Расіяй, Казахстанам і Беларуссю.

Заходнія аналітыкі і палітолагі не змаглі прадказаць такога развіцця падзей. А вось кіраўніцтва завода, на якім выпускаюць тэлевізар з рускамоўнай назвай, выведзенай бліскучымі лацінскімі літарамі, на нейкім звышінтуітыўным роўні гэта ведала, бо меню беларускага тэлевізара „Horizont” зрабіла на трох мовах. Рускай, ангельскай і... украінскай.

Беларускай мовы там няма. Відаць кіраўніцтва вырашыла, што гэта не заходні мабільны тэлефон „Nokia”, дзе меню па-беларуску ёсць, і не сусветны партал „Google”, які зрабіў цудоўны электронны перакладчык на беларускую мову з якой хочаш, нават з арабскай. Кіраўніцтва завода, на якім выпускаецца „Horizont”, відаць думае, што беларуская мова больш нікому не спатрэбіцца з тае прычыны, што гэтыя працэсы, якія ідуць зараз на постсавецкай тэрыторыі, зінтэгруюць нас назад туды, дзе мы асімілявацца мусім.

Але на гэты раз інтуіцыя іх падвяла. Краіна і яе незалежнасць гэта тэрыторыя, на якой свята выконваюцца нормы Канстытуцыі гэтай краіны. У Расіі такой тэрыторыі, дзе б працавалі нормы расійскай Канстытуцыі — няма. А значыць няма куды і інтэгравацца. Ні нам, ні ўкраінцам. А каб зрабіць свой тэлевізар беларускім прадуктам, ды яшчэ канкурэнтным, трэба памяняць і назву, і „меню”.

Віктар САЗОНАЎ

Метамарфозы, або як маецца моль да міногі

Як упарты *hellulo librorum*, іначай кніжная моль, страсна завітваю ў бібліятэку ў Нарве. Спяшаючыся да яе, іржу радасна як конь. Бо кніжак там, што аўса ў конскім раю. Са шмат якімі я пазнаёміўся асабіста, чыста з маімі суседзямі з вёскі; іншыя ведаю толькі ў твар. Хоць распазнаю іх усе па спінках, па рознакаляровых плашчыках з фольгі і з кожнай вітаюся як з кімсьці сабе блізкім. Аднак пры праслаўленых навінках вяду сябе асцярожна — іхняя мова не вельмі мне даспадобы. Праўда, шмат у іх фотаздымкаў, многа іканаграфіі, ды запас слоў у іх нейкі расхістаны і неразборлівы. У свеце тэлекарцінак гэтае памкненне не спыніць. Гэта як прыток чужых, што раскупляюць вясковыя хаты. Гэты працэс не абмінуў і маёй вёскі. Спрабуем сябе ўзаемна чытаць, мы тутэйшыя і яны — прышэльцы з горада. Яшчэ акажацца, ці гэтыя нялёгкія чытанні будуць вартыя ўзаемнага старання. Падобна як структура вёскі, мяняеца таксама і нарваўскі кнігазбор. Штораз больш у ім кніг для мяне чужых — сенсацыі і жорсткіх раманаў. Дарэчы, час у нас адносна спакойны, дык адкуль бярэцца тая схільнасць да насілля? Вядома, такімі друкуюцца кнігі, якія чытачы — штораз менш адкрытыя на іншых, штораз больш яны зачыняюцца ў сваіх негеройскіх аўтабіяграфіях. Шкада, што і ў вёсцы адбываюцца такія ж змены. Людзі ўжо не гамоняць грамадой на лавачках пад хатай. Калісьці было іх столькі, колькі і хацін. Сёння яны ўжо непатрэбныя. Замянілі іх тэлефоны. Хаця — ёсць надзея. Аднойчы я быў выпадковым сведкам размовы пажылых ужо гаспадыняў. Адна з іх, азірнуўшыся, ці хто з яе не насмяецца, выцягнула з-за пазухі мабільнік: „Насця? А дзе ты? У агародзе?! То ж і я ў агародзе. А што, не бачыш мяне? Э-э-э-э, бо мяжа зарасла зеллем. Што я раблю? Капусту са слімакоў чышчу.... Алё-ё-ё! От і засенг мне прапаў. На-а-аступся! — раскрычалася. — А што-о-о?! — адклікнулася Насця з кустоўя. — А шмат у цябе слімакоў? — Ой, мно-о-о-ога!” І так гаманілі яны адна з адной да вечара. Ды, вяртаючыся да бібліятэкі, дык у мяне з ёю адна праблема. Кніжак, што стаяць на паліцах ніжэй лініі маіх бёдраў, ніяк не магу перагледзець. Я блізарукі, а з-за трэснутых меніскаў ніяк не магу прысесці ў пазіцыі жабы. Хоць у апошні час, бы сляпой курыцы, удалося мне дзеўбануць сапраўдны рарытэт — *Życie polskie w dawnych wiekach* Уладыслава Лазінскага. А ў ім успамін аб беластоцкай бібліятэцы Яна Клеменса Браніцкага, у якой змяшчалася 170 тамоў. А коней у ягамосці вялікага гетмана было аж дзвесце! Цікава, што падобныя прапорцыі ў нарваўскай бібліятэцы паміж чытачамі і карыстальнікамі камп'ютарнай майстэрні. На жаль, гэтых першых меншае, затое аматараў інтэрнэтнага сеціва таўчэцца там столькі, колькі коней стаяла ў гетманавых стайнях. Толькі што конікі хоць порскалі адзін на аднаго, а гэтыя як начныя фотатрапічныя матылі быццам бы сядзяць побач сябе, а кожны асобна вытрэшчваецца ў люмінесцэнтны экран. Мне цікава, колькі яны з яго вычытаюць. Паводле моцна паношанай інфармацыі, змешчанай у *Columbia Journalism Review*, у 2006 годзе свет вырабіў 161 гексабайт (гексабайт гэта мільярд мільярдаў байтаў) лічбавых даных. Гэта ў тры мільёны раз больш чым лік інфармацый змешчаных ва ўсіх кніжках напісаных за ўсю гісторыю людства! Год пазней той лік дасягнуў 988 гексабайтаў. Колькі іх у 2011 годзе? І як гэта ўсё ахапіць? Мне больш даспадобы кнігі. У апошні час бяру кнігі пра прыроду. Калі мая суседка скардзілася перада мною на крыўдлівыя для яе інсінуацыі пляткуючых суседак, асацыяцыя іх з соскавуснымі пазваночнымі, да якіх належаць вугрападобныя марскія міногі, была, дарэчы, слушная. Міногі, падобна, як і плеткары, маюць круглыя раты, якія дзейнічаюць як прысоскі. Дзякуючы ім прычапляюцца да цела ахвяр. Ну і тады пачынаецца пірышча — зубастымі язычышчамі прабіваюцца праз скуру і жыўцом высмоктваюць крывавячае мяса! Старажытныя рымляне, якія лічылі міногаў далікатэсам, каб тыя хутчэй таўсцелі, кідалі ім на жыр злачынцаў. А бывала, што і нявінных хрысціян. Ну, што ж, наш свет ніколі не быў дасканалым. Такой можа быць толькі бібліятэка. Гэта ў ёй святасць і злачынства, справядлівасць і хлусня, праўда і дурнота маюць аднолькавы маштаб — кніжкі. А гэтую, якой бы яна не была, піша чалавек. І так, як піша, так і чытае. А калі не чытае, дык што запісвае ў кнізе свайго жыцця? І хто гэта да яе працягне руку?

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Выбарчыя вынікі

Ужо вядома. Першае пасяджэнне парламента новага склікання адбудзецца 8 лістапада. Згодна з выбарчым законам Падляшскае ваяводства ў Сейме прадстаўляць будуць чатырнаццаць дэпутатаў. У рэгіёне найбольш мандатаў здабыло ПіС (у Сейме агулам 157 мандатаў). Дэпутатамі ад гэтай партыі сталі (па чарзе па ліку здабытых галасоў) Кшыштаф Юргель, Марыюш Камінскі, Яраслаў Зялінскі (уся тройка зноў засядае ў ніжэйшай палаце), Дарыюш Пянткоўскі, Лех Калакоўскі і Яцак Багуцкі. Пераможная партыя ва ўсёй Польшчы (207 мандатаў на 460 у Сейме) — ГП у падляшскім рэгіёне здабыла пяць дэтутацкіх мандатаў. З найбольшым лікам галасоў (41 047 гласоў) увайшла ў Сейм тадышняя і новая міністр навукі і вышэйшай асветы праф. Барбара Кудрыцкая. Дэпутатамі ад гэтай партыі зноў сталі Роберт Тышкевіч, Дам'ян Рачкоўскі і Яцак Жалек. Увайшла таксама сеймавая пачаткоўка, якая прадстаўляе Сувальшчыну — Бажэна Камінская. Дзеячы падляшскай Платформы разлічвалі на шэсць мандатаў. У сваю чаргу рэгіянальны СЛД (ягоныя прадстаўнікі зоймуць толькі 27 дэпутацкіх крэслаў) хацеў здабыць прынамсі два мандаты. Маюць адзін. Зноў грамадскім даверам выбарцаў карыстаецца Яўген Чыквін (14 289 галасоў падтрымкі; у папярэдніх выбарах атрымаў 14 234 галасы). Выйграў ён з лідарам спіска і яе вялікім страчаным Яраславам Матвеюком (13 711 галасоў; у папярэдніх выбарах — 20 770). Таксама ПСЛ (генеральна ў Сейме мае 28 дэпутатаў) на Падляшшы хацела больш, а здабыло падтрымку, якой было дастаткова толькі на адзін мандат. Здабыў яго нечакана не лідар спіска, а балатуючыся з далейшай пазіцыі Эдмунд Бараўскі. Так, як і ва ўсёй краіне, і на Падляшшы для назіральнікаў палітычнага жыцця нечаканасцю быў знакаміты вынік Руху Палікота (агулам 40 мандатаў). Дэпутатам ад гэтай групоўкі з'яўляецца 27-гадовы прадпрымальнік з Аўгустова Адам Рыбаковіч.

Калі гаворка пра нашых, не ўдалося ўвайсці ў Сейм намесніку прэзідэнта Беластока і дарадчыку прэзідэнта РП Аляксандру Сасне (быў дзевяты на спіску ад ГП; 7 645 галасоў падтрымкі), які падобна як Яўген Чыквін разлічваў на праваслаўны электарат. Таксама не ўдалося бурмістру Міхалова Марку Назарку (адзінаццатая пазіцыя на спіску ад ГП; 2 636 галасоў). У сваю чаргу, разлічваючы на праваслаўнае і беларускае асяроддзе, Міхал Карповіч (СЛД) здабыў галасы ледзь 1 144 выбарцаў, а прадстаўнік Падляшскай управы Валянцін Карыцкі (ПСЛ) — 2 254 галасы.

Агулам у паветах, дзе ў значным ліку пражываюць беларусы, вынікі склаліся наступным чынам: на Гайнаўшчыне перамаглі СЛД (35%) і ГП (31%), на Бельшчыне — ПіС (40%) ды СЛД і ГП (па 19%), на Сямятыччыне — ПіС (37%) і ГП (23%), на Сакольшчыне — ПіС (36%) і ПСЛ (28%), на Беласточчыне — ПіС (42%) і ГП (30%).

У Беластоку перамагла ГП. Што цікавае, у Гайнаўскім павеце аб поспеху — падобна як пару гадоў таму Самаабарона — можа сказаць Рух Палікота. Апынуўся ён тут на трэцім месцы (15% падтрымкі; на ўсім Падляшшы — 8%). На маю думку, у нашым рэгіёне ў пройгрышы ў Сейм з'яўляецца Грамадзянская платформа (цяпер здабыла падтрымку 30% выбарцаў, а чатыры гады таму мела 32%). ПіСу ў сваю чаргу — як пасля выбараў сказаў Кшыштаф Юргель — улалося вярнуць сабе ў рэгіёне дзесяць тысяч галасоў. Хацелася б прытым сказаць: цяперашні парламент не будзе поўнасцю прадстаўнічым для ўсяго польскага грамадства. Таму што прагаласавала ў маштабе краіны ледзь палова выбарцаў. Так, аднак, найбольш выгадна гаварыць тым, хто ў пройгрышу, а такімі з'яўляюцца таксама тыя, што не пераканалі выбарцаў да таго, каб тыя пайшлі на выбары, хоць самі нават здабылі мандаты.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

САМАРОДАК з-пад скібы і мяжы

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Прызнаюся і каюся — пра Язэпа Карпюка з Сямятыч ведаў я мала. А гэта мой грэх вялікі. Бо хаця ён з'яўляецца чалавекам надта сціплым, у яго неардынарная і яркая душа. Так склаўся ягоны лёс, які каваў не толькі ён сам; шмат агню ў горан ягонага лёсу надулі нават адлеглыя ў часе і прасторы рэвалюцыянеры...



Язэп Карпюк нарадзіўся ў 1933 годзе ў Машчонай-Панскай. Там таксама прайшло ягонае дзяцінства і маладосць. У школу хадзіў пры немцах, няпоўныя тры класы тады завяршыў. Школа ў Машчонай-Панскай была тады нямецка-беларуская. А вось у суседняй Каянцы, дзе насельніцтва каталіцкае, ніхто ў школу не хадзіў. Вучылі, пакуль немцы на Маскву ішлі, а калі адступалі, то і ўсё рассыпалася.

Цікаўлюся школьным будынкам, што ў Машчонай-Панскай; гадоў ужо некалькі мінула, калі я там быў апошнім разам, навучанне ў вёсцы ўжо тады было даўно спынена. Але ў тым будынку, які быў пабудаваны яшчэ ў царскі час, вучні пры немцах не вучыліся, займалі яго жандары. Дзеці вучыліся ў хаце Язэпа Карпюка дзеда. Нямнога ўдаецца мне даведацца ад субяседніка пра ягоныя адукацыйныя справы, спачатку, бо пазней выявіць той боль душы ад прапушчаных адукацыйных магчымасцей.

Вайсковая служба праходзіла ў Жэшаве.

— Там я, шэры хлапец з-пад скібы і мяжы, пабачыў іншы чым у нас свет, — кажа спадар Карпюк. — У войску пыталі, хто не мае завершанай асноўнай адукацыі; можна было яе папоўніць і сёння шкадую, што не пакарыстаўся той магчымасцю. Толькі калі вярнуўся з войска і стаў на дзяржаўную работу, тады закончыў вечаровую падставоўку.

— А якім чынам перад Вамі адкрыўся ў войску іншы свет, што Вы такое пабачылі?

— Жэшаўскае ў той час было для мяне іншым ад Беласточчыны светам. Тут шэрасць, а там прамысловасць, бо я служыў у такой часці, якая ахоўвала прамысловыя аб'екты. І мне ў галаве тады не месцілася пабачанае, як там людзі жывуць. У Жэшаве бываў, у Баранаве-Сандамерскім, у Сталёвай Волі...

Вярнуся да дзяцінства: калісь у бацькі была гармошка. Да старэйшага брата прыходзілі калегі і гралі. А была ў нас такая сучка, якая ў той час выла. Яны граюць, яна вые, а я плачу. І яны, хлопцы жулікаватыя, сходзіліся да нас і так падыгрывалі, бо іх гэта весяліла.

А са школай не атрымалася, трудна. Я з'яўляюся такім жыццёвым самародкам. Вяртаюся ўспамінамі да бацькоў, якія не разумелі важнасці гэтай справы. Найважнейшай у іх была праца ў полі і так мая адукацыя сышла на далейшы план.

У Жэшаве палюбіў спяваць, у хоры быў, там крышку музыцы падвучыўся ў рэгента — Мірошчанка называўся. Прыехалі тады скаўты з Цэнтральнага мастацкага ансамбля Войска Польскага, набіралі кандыдатаў. Я прайшоў падборку, але аставалася мне паўгода да канца службы, няварта ўжо было. Каб быў туды пайшоў... А так вярнуўся дадому, на гаспадарку, абрабляць зямельку. Пасля стаў на працу ў ПОМ у Бацікі. І так завязалася-завязалася... Пасля перанеслі ў Сямятычы, добра ішло, пайшлі добрыя грошы, пабудаваў свой дом і так жыву.

Пасля ў царкоўным хоры спяваў, вёў яго Пётр Кузьмюк. Быў гэта выдатны чалавек, шчыры і выдатны музычны знаўца. З'язджаючы ў Варшаву падарыў мне кніжку Кудраўцава і Таранушанкі „Теория музыки", я яе развучыў і ўсё мне стала простым. І сёння я стаўлюся крытычна да спеваў некаторых царкоўных хароў — нешта папсавалася, мне здаецца.

— А Ваш тата на акардэоне граў?

— Не, не граў. Гэта была нейкая сямейная памятка, магчыма, што нехта раней на ім іграў. Пасля бацька тую гармошку прадаў і мы пад яе яшчэ танцавалі.

— А ўсё ж такі Вашае захапленне музыкай аднекуль узялося...

— Гэта справа спадчынных генаў. Бо часта тата з мамай сядалі і спявалі — цудоўна тады было. І спявалі яны па вяселлях, хрысцінах, у гасцях...

— А ў царкве яны не спявалі?

— Не.

— Часта ў царкве бывалі?

— Не, мо так раз у месяц. Царква далекавата была, у Жэрчычах, за пяць кіламетраў.

— А мо царкоўныя спевы таксама ўзнімалі Вашае захапленне музыкай?

— Я ў той час быў ужо падросткам, але я ўжо адчуваў музыку — яшчэ ведаў не меў, але адчуваў. У Жэрчычах не было каму спяваць. Але быў там дзяк, Мірановіч, то тады аж хацелася слухаць, як той хор з ім спяваў — тыя самі людзі, а зусім іншы атрымліваўся спеў. Але да спявання не было ў мяне вялікай цягі, і не думаў, што буду спяваць. Але калі пабудаваўся ў Сямятычах, трэба было высвяціць дом. Прыйшоў айцец Рыгор Сасна. Я сказаў, што ў Сямятычах вельмі прыгожа спяваюць.

— А Вы можа ў сваім прыходзе таксама спявалі ў хоры? — спытаў бацюшка.

— Не, але я ў арміі ў палкавым хоры спяваў.

— О, то я Вас прымечу!

Зайшоў я ў царкву, а ён мяне ўбачыў і адразу на клірас завёў, да Пятра Кузьмюка. Так я стаў спяваць.

І стаў пісаць; у „Ніву" пісаў. І хачу сказаць адну такую простую і прыкрую думку. Цяпер усе, на цэлым свеце, крычаць, што чалавек найважнейшы. Але ніхто чалавека не шануе. Чалавек да таго часу астаецца чалавекам, пакуль ён знаходзіцца ў мацярынскім лоне. Але калі толькі народзіцца, то адразу яго мах то туды, то сюды — то да партыі, то да згуртаванняў...

У Сямятычах з маёй парукі паўстаў літаратурны клуб. Яны збіраліся, пісалі, але не было як выпускаць тую творчасць. А я раней быў каля дзесяці гадоў засядацелем у судзе і кажу галоўнай арганізатарцы, каб паехала ў Бельск, у суд, і там зарэгістравала той клуб. Так і было.

Але мяне тое не цікавіць, тое што яны робяць гэта не паэзія. У мяне паэзія гэта метафара, глыбокая і высокая. Я лічу сябе самародкам. А самародак, калі б быў нават феноменам ведаў і эрудыцыі, калі б пераўзыходзіў усіх, а не меў паперкі, то і па ўсім!

А мой лёс склаўся цяжка. Мая мама была ў бежанстве ў Расіі, у час рэвалюцыі. І яна ўвесь час на нас крычала: „Не лезьце ў ніякую арганізацыю, нічога не вывучайце, бо гэта бяда!". Бачыла яна ў Расіі, як там яны рэзаліся. Гаварыла: „Вы з'яўляецеся маімі дзецьмі і я вас прашу нікуды не лезці...".

Слоў некалькі пра бацьку. Зараз па вайне адбыліся першыя перапісы насельніцтва. У Машчонай і настаўнік быў, і з Сямятыч з гімназіі наехалі, парабілі перапіс на сваіх адрэзках і ўсё ў іх атрымалася няправільна. А на тым адрэзку, які выканаў мой бацька, не была патрэбная ніякая праўка! Два тыдні пазней з Беластока прыязджае ў наш хутар, бо тады мы там жылі, на падворак, чорная „волга" з Ваяводскай рады і намаўляюць бацьку на працу ў той Ваяводскай радзе. Маці нарабіла крыку: „Нікуды не пойдзеш!" Каб тады быў бацька перасяліўся...

— А калі ў Вас наспела патрэба пісаць, выказаць свае пачуцці не мелодыяй, а словам?

— Гэта было, бадай, у 1978 годзе. Напісаў верш з нагоды 25-годдзя ПОМу. Пасля лісты з войска знайшоў і ў адным з іх адкрыў паэзію, сваю. Я нават не ўсведамляў, што ў мяне дар. І тое асмеліла, і стаў пісаць — песні, іншае. У „Ніву" апавяданні пісаў.

Мяне трывожыць цяперашні час. Калісь з Дэркоўскім пайшла гутарка пра народную культуру. І я затрывожыўся, што станецца з цяперашняй культурай. Прапанаванне народнай культуры занядбоўвае сучасную. Сёння многае памянялася. Слухаю музычныя перадачы ў тэлебачанні, а там — чым горш спяваюць, тым лепш; бо яны спяваюць толькі сабе.

Я хацеў бы, каб хто мне памог стварыць альбом песень на словы нашых паэтаў — Шведа, Шаховіча, Лукшы, я да іх мелодыі напісаў. І літаратурныя задумы ў мяне ёсць...

Найбліжэйшая сэрцу

У тую ноч
Ты стала каралевай зорак
ззяючай у зеніце
галактыкі
асвятляючай маю існасць
рукі майго зроку
падняліся ўверх
бесперапынна віншуючы Цябе
я застыў у далягляддзе
Тваёй светласці
насалоджваўся раздоллем
якое нас злучала
я здзейсніў тады подзвіг
скарыў бар'ер нясмеласці
я стаў слупам
на якога плячах
былі ўстаноўлены
правады бязмежнасці
зрэнкі маіх вачэй
насалоджваліся Табою
а я ўсё стаяў
слухаючы гімнаў
славячых нашу лучнасць
як анёльскіх спеваў
упрыгожаных Тваім ззяннем
зыходзячым ад светласці
накшталт райскай
менавіта тады
ўдарыла сэрца
ў звон любві
я крануўся з месца
і няспынна лячу да Цябе
да маёй каралевы зорак

Пераклад з польскай мовы А. Вярбіцкага

Як дапамагаюць невідучым

Маляўнічая Мушына распаложана над трыма рэкамі Папрадам, Мушынкай і Шчаўнікам, на мяжы Польшчы і Славакіі. У гэтым 5,5-тысячным горадзе знаходзіцца санаторыя „Нестар" для невідучых. Быў я ў ёй на працягу двух тыдняў у кастрычніку гэтага года. У санаторыі невідучых лечаць. Яны маюць прыпісаныя лекарам працэдуры. Тут таксама арганізавалі вечарыны з канцэртамі, танцы ля вогнішча пад гукі рэгіянальнай капэлы, пешыя экскурсіі на гару Башта з руінамі старажытнага замка ды да вадапоек з крынічнай мінералізаванай вадой у Мушыне, у мясцовы рэгіянальны этнаграфічны музей.

Удзельнікі кастрычніцкага заезду ўдзельнічалі ў экскурсіях у Старую Любоўлю на Славакіі (тут знаходзіцца добра захаваны замак), у Закапанэ (прагулка па горадзе і гары Губалуўка, язда на канатнай дарозе), у Каманчу (скансэн вулляў, пасека Борць імя кс. Остаха), у Пеніны (запаведнік Гамоле) ды шляхам лэмкаўскіх цэркваў польска-славацкага памежжа).

Дырэкцыя санаторыя належна клапацілася пра людзей з белай палачкай у руцэ. Усе яны атрымалі змястоўную інфармацыю дзе і ад каго могуць атрымаць дапамогу ў тым, каб паехаць у санаторый, купіць камп'ютар з дафінансаваннем НФЗ або радыёпрыёмнік ды спецыяльныя акуляры.

7 кастрычніка адбылося ўрачыстае святкаванне 75-годдзя санаторыя „Нестар" у Мушыне і 60-годдзя Польскага саюза невідучых. Заслужаныя працаўнікі санаторыя атрымалі медалі і адзнакі. Была мастацкая частка ў выкананні дзявочай групы мясцовага асяродка культуры і багатае застолле.

Менш прыпынкаў

Зноў паменшага аўтобусных прыпынкаў ПКС у Беластоку. Яшчэ дагэтуль пасажыры аўтобуснай лініі ПКС з Гайнаўкі ў Беласток праз Нараўку і Міхалова маглі высесці з аўтобуса ПКС ля гатэля „Галэмбеўскі". І гэта было ўсім выгадна. Ехаў аўтобусам ПКС, які з Гайнаўкі выязджае а гадзіне 15.25 і ў 17.30 прыязджае ў Беласток. Пасажыры, а ў тым ліку і я, хацелі высесці на алеі Пілсудскага за скрыжаваннем з кругавой развязкай ля гасцініцы „Галэбмеўскі", але вадзіцель паведаміў, што тут не спыніць аўтобуса. Паехаў я тады на аўтобусны вакзал і пайшоў даведацца, чаму гэта так, што адзін шафёр затрымлівае аўтобус у цэнтры горада, а другі — не. Дыспетчар руху паінфармаваў, што аўтобусы ПКС ля гатэля „Галэмбеўскі" не прытрымліваюцца ад 1 чэрвеня г.г. Цікавінкай з'яўляецца тое, што пасажыраў з напрамку Гайнаўка — Міхалова — Жэдня возяць у канец алеі Пілсудскага і там ёсць для іх аўтобусны прыпынак, а пасажыраў з Гайнаўкі ў Беласток, якія едуць праз Нарву, возяць на прыпынак па вуліцы Юравецкай. Чаму адным пасажырам можна высесці на вуліцы Юравецкай, а іншым не, мне не ўдалося высветліць.

Дадам, што зараз аўтобусы ПКС не затрымліваюцца ў цэнтры горада, каб забраць пасажыраў у Гайнаўку ці ў Белськ-Падляшскі або Міхалова, Гарадок, Бабровнікі.

Білеты на праезды аўтобусамі ПКС падаражэлі. У Ляўкова білет каштуе 15 злотых. А дзе дбайнасць пра камфорт пасажыра? **Янка ЦЕЛУШЭЦКІ**

Сужонства **Раман і Альжбета Туркевічы** з Чаромхі-Станцыі вядомыя не толькі ў мясцовым асяроддзі ці на Гайнаўшчыне, але ў краіне, а нават за рубяжом. Абое — пенсіянеры. Іхняя страсць гэта агратурызм, а характэрная рыса — гасціннасць.

Гасцінная гаспадарка „Ром-Тур"

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

— Агратурызмам я пацікавіўся ў 1998 годзе, — пачынае аповед Раман Туркевіч. — У час фолькавых сустрэч загадчыца мясцовага цэнтра культуры Тамара Кердалевіч прапанавала арганізаваць турыстам начлежную базу. Ідэя мяне зацікавіла. У 2000 годзе наладзіў я супрацоўніцтва з Фондам дапамогі вёсцы. Накіравалі мяне на абучэнне. Бліжэйшыя тры гады займаўся я вывучэннем пытання арганізацыі гаспадарчай і агратурыстычнай дзейнасці, стандартызацыі аб'ектаў вясковай начлежнай базы, прымянення ашчадных тэхнічных развязак у сферы выкарыстання вады і электраэнергіі, затым удзельнічаў у курсах у рамках праекта „Кампанія ў карысць абмежавання страт, прычыненых жывёлай, якая ахоўваецца законам (воўк, зубр, бабёр) на абшары Зялёных лёгкіх Польшчы". Атрымаў я адпаведныя сертыфікаты. Хачу адзначыць, што вялікую падтрымку ў пачатках агратурыстычнай дзейнасці атрымаў я не толькі ад Фонду дапамогі вёсцы, але і ад Лакальнай групы дзеяння, у якой удзельнічаю.

— Пачаткова арганізаваў я трыццаціместнае палатачнае поле, — працягвае мой субяседнік. — Затым заняўся арганізаваннем начлежных кватэр у памяшканнях. Асаблівым атракцыёнам з'яўляюцца ў нас кватэры ў ветраку, які стаіць побач палатачнага поля. Першымі гасцямі было сужонства з Астралэнкі (і па сённяшні дзень прыязджаюць на адпачынак у летні час). Пастаяннымі кліентамі з'яўляюцца госці з Груйца, Варшавы, Любліна, Гданьска ды іншых гарадоў. У час Фестывалю „Сустрэчы з вясковага панадворка" фаны прыязджаюць сем'ямі, а нават па некалькі сем'яў у групе, якія з сабою сябруюць. Апрача таго начлежнай базай карыстаюцца турысты, якія падарожнічаюць прыгранічным веласіпедным шляхам Мельнік — Белавежа. Адлегласць з Мельніка ў Чаромху — 36 кіламетраў, а з Чаромхі ў Белавежу — 52 км.

— Веласіпедны шлях Белавежа — Пяскі — Чаромха, — прыкмячае Раман Туркевіч, — затым Чаромха — Мельнік гэта мая ідэя. Зараз рэкамендую арганізаваць шлях Сямятычы — Мілейчычы — Рагачы — Мядзвежыкі — Чаромха — Пагулянка — Дабрывада. Для ажыццяўлення гэтай ідэі неабходныя грошы, а з гэтым складаная справа. Не заўсёды знаходзяцца спонсары. Па меры магчымасці атрымліваем падтрымку ў рамках прамоцыі ад самаўрадавых устаноў ды згаданага Фонду і Лакальнай групы дзеяння. Аднак у асноўным вымушаны мы карыстацца ўласнымі сродкамі. Шмат каштуюць інфармацыйныя выданні, напрыклад, буклеты, кампакт-дыскі, даведнікі, паштоўкі аб Чаромсе (выдаў я 10 тыс. штук), аўтадарожныя карты. Выдаткі пакрываю з камандзіровачных раднага ды прыбытку ад агратурызму.

— Агратурызм гэта маё хобі, а не бізнес, — заяўляе гаспадар. — Гэта шырокая платформа для новых знаёмстваў і здабывання сяброў. Для гасцей арганізаваў я „Гістарычны куточак памяці і традыцыі рэгіёна і чыгункі". Справай пачаў займацца з 2000 года. Экспанаты здабываў усялякімі спосабамі: купляў на рынку, атрымліваў ад сяброў і знаёмых з усяе Гайнаўшчыны. Былі гэта прадметы хатняга ўжытку, прылады для апрацоўкі поля і ўборкі збожжа, даўнейшы абутак і вопратка, старыя дакументы, фатаграфіі, прафсаюзныя білеты, службовыя спраўкі і пасведчанні асобы ды іншае. Асобнае месца займаюць чыгуначныя экспанаты. Шмат гэтага накапілася, пачаўшы ад прадметаў, якімі карысталіся працаўнікі пасобных служб, а закончыўшы на службовых мундзірах, старых дакументах і фатаграфіях. Атракцыёнам з'яўляюцца прасы на вугаль міжваеннага перыяду, нафтавыя лямпы, даўнейшая кухонная пасуда, латуневы распыляльнік для атручвання мух ці кавальскія вырабы. Рэалізуючы ідэю свайго „мінімузея", — канстатуе ў заканчэнні суразмоўца, — хацелася б напомніць госцям гісторыю, культуру і традыцыю мясцовай грамадскасці, ды паказаць перамены, якія наступілі з цягам часу.

З буднямі Чаромхаўскай гміны прыезджыя могуць пазнаёміцца, гартаючы старонкі скрупулёзна запісанай гаспадаром хронікі. Свае заўвагі госці могуць занесці ў адмысловую хроніку гасцінай гаспадаркі „Ром-Тур". Вось некаторыя з іх:

„Niech to miejsce będzie — jak bocianie gniazda — zawsze pełne i rozbrzmiewające radością i muzyką, niech daje gościnę i wytchnienie zdrożonym i zapracowanym; niech raz tu zajrzawszy — zawsze powracają, czego niewątpliwą zasługą są wspaniali gospodarze tego miejsca! — Teresa i Marek Mielniccy z Ostrołęki. 25.05.2005 r."

„Za gościnę dziękuję, że tak krótko — żałuję. Lecz ogromne serdeczności z życzeniami wielu gości zostawiam i do zobaczenia! (na rowerze oczywiście) — Justyna, wrzesień 2009 r."

„Za górami, za lasami,
Rządzi Roman turystami.
Goście, którzy tu bywają...
to ROM-TUR-a uwielbiają!!!
Jest jak Ojciec, jest jak Brat,
Tu jest całkiem inny świat.
Co rok Grójec tutaj wraca,
Bo tu nigdy nie ma kaca.

Za wyjątkową gościnę dziękują trzy grupy z Grójca. Rezerwujemy ten wiatraczek na rok 2008!!"

Гартаю карткі памятных запісаў гасцей спадарства Туркевічаў. Усе яны сардэчныя, ветлівыя і выказваюць падзяку гаспадарам за гасцінасць, якую ад іх атрымалі. Але не адзіная гэта рыса характару Рамана Туркевіча. Ён адданы справе чалавек — шматгадовы грамадскі дзеяч і радны трэцяга склікання.

Размова з ***Раманам Якаўлеўскім****, незалежным палітычным аглядальнікам з Мінска, аглядальнікам на саміце Усходняга партнёрства ў Варшаве*

Дэмарш пасла



„Ніва": — ***Як Вы ацэньваеце непрысутнасць беларускіх афіцыйных прадстаўнікоў на варшаўскім саміце Усходняга партнёрства?***

Раман Якаўлеўскі: — Гэта канстатацыя адсутнасці — падкрэсліваю — запрошанага на сесію беларускага амбасадара ў якасці афіцыйнага прадстаўніка...

— ***...Спачатку кіраўніка беларускага МЗС Сяргея Мартынава...***

— А пасля амбасадара. Першы дэмарш Мартынава, другі амбасадара Віктара Гайсёнка, якія праігнаравалі запрашэнне, — сведчаць аб фактычным афіцыйным мінскім байкоце саміта Усходняга партнёрства. Гэта, натуральна, канстатуе тое месца, падкрэсліваю, афіцыйнага Мінска вось у гэтай ініцыятыве, на сённяшні дзень. Бо казаць, што Беларусь адсутнічае ў гэтым сэнсе нельга. Тут буйная дэлегацыя прадстаўнікоў недзяржаўнага сектара, беларускай апазіцыі, якая прымалася на вельмі высокім, на найвышэйшым, узроўні, польскімі ўладамі, і асабліва я хацеў бы падкрэсліць неафіцыйную паўтарагадзінную бяседу Ангелі Меркель. Гэта вельмі важкае, бо, наколькі мы ведаем, нямецкі канцлер ніколі так доўга з беларускай апазіцыяй не размаўляў. Я б сказаў, Аляксандр Лукашэнка не толькі за сваю прэзідэнцкую кар'еру, але ўвогуле за ўсё жыццё агулам ніколі столькі не размаўляў з заходнімі лідарамі. Гэта вельмі важка, што Нямеччына займае такую вельмі жорсткую пазіцыю.

— ***А што абазначае сустрэча беларускай апазіцыі з намеснікам прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі?***

— Гэта абазначае, што Захад пасля падзей 19 снежня ставіцца вельмі жорстка і прынцыпова. Гаворыць аб кансалідацыі Захаду ў дачыненні да Беларусі.

— ***Што будзе далей?***

— А — ніхто не ведае. Я ў такіх выпадках так кажу: усе мяркуюць, Лукашэнка выракуе. Ну, як мы можам прагназаваць. І ў гэтым небяспека будучыні — што мы не ведаем, што ў Лукашэнкі заўтра будзе.

— ***А для чаго была дэкларацыя Лукашэнкі ў час сустрэчы з балгарскімі чыноўнікамі МЗС наконт палітвязняў і абяцання іх звальнення восенню?***

— Гэта гаварыў толькі балгарскі міністр, па-першае. І, па-другое, быў гэта таямнічы візіт, і, па-трэцяе, як сказаў польскі МЗС, — гэта была прыватная ініцыятыва Сафіі. Наколькі я ведаю, у тым ліку пры гэтай сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам абмяркоўвалася пытанне — гаварылі ад патрабаванняў вызвалення палітвязняў. І так савецкі варыянт, напрыклад для Саннікава, як Салжаніцыну: супраць яго волі, высылаць у Сафію. І следам за гэтым і пазбаўленне яго грамадзянства Беларусі. Так як і ў выпадку Салжаніцына — па-савецку. І такім пунктам назначэння можа быць Сафія. А для Захаду гэта — хто б гэта не гаварыў — можа быць прыемна. Чаму? Галоўнае, што жыў-здароў. А Лукашэнка: вось калі яго сям'я хоча аб'яднацца — хай усе едуць! І ўсё! І пытання няма. І ён выканаў бы такое вызваленне. А чаму такім спосабам? Ну, Саннікаў жа не піша прашэння, як я яго магу вызваліць? — думае Лукашэнка. Такое савецкае рашэнне, супраць волі, гэта пазбаўленне Радзімы.

— ***А наконт гэтага, чаго хочуць на саміце, між іншым, — рэабілітацыі ўсіх беларускіх палітвязняў?***

— Гэтаму не быць. Ну што, Лукашэнка сам сабе страляць у галаву будзе? Гэта немагчыма — гэта было б прызнацца, што ён памыліўся. Калі хто ведае такія выпадкі, калі Лукашэнка казаў што ён памыліўся? Толькі ў адным выпадку, калі памыліўся ў кадравай палітыцы, з адным намеснікам міністра. Так што гэтая такая высокая планка робіцца для таго, каб увогуле дастаткова прынцыпова гэтае пытанне паставіць.

— ***Што канкрэтна павінен акрэсліць Еўрасаюз у адносінах да Беларусі?***

— Я б вельмі жадаў, каб Еўрасаюз акрэсліўся, па-першае, са сваёй знешняй палітыкай, каб яна была адзіная. Яе, на жаль, няма, у прыватнасці да Беларусі. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, заява літоўскага прэзідэнта і шэрагу іншых еўрапейскіх лідараў. Яны і пасля падзей 19 снежня засталіся. Як гэта не дзіўна гучыць, Лукашэнка для сваёй брутальнай палітыкі фактычна кансалідуе Еўрасаюз у знешняй палітыцы. Але ж, як мы бачым, на сённяшні дзень гэтага недастаткова.

— ***Чаму так адбываецца ў Еўрасаюзе?***

— Там 27 краін, суверэнных.

— ***Які ў іх інтарэс у гэтым?***

— Рэальпалітык, прагматык. Сярод гэтых краін на першым месцы была Нямеччына. Сёння гэтага няма. Дойчэ-банк адмовіўся ад Беларускалія. Мы сёння бачым гэта паводле Меркель. Нельга ігнараваць інтарэсы свайго буйнейшага бізнесу. Гэта для Лукашэнкі дрэнна і сведчыць аб тым, што ў гэтым годзе ўпершыню не адбудзецца Мінскі форум для беларуска-нямецкіх бізнесоўцаў. Прытым ясна ў заяве, чаму яго не будзе: з-за пагаршэння сітуацыі ў Беларусі. Я не пераўвялічваю ролю Польшчы, але мы ведаем, якую вагу мае Нямеччына ў Еўрасаюзе. Гэта важна. Там *пянёндзы*. І калі Меркель, наколькі вядома, так кантактавалася з апазіцыяй, словы пра падтрымку з яе вуснаў — гэта вельмі важкае. Як на самай справе будзе, цяжка сказаць. Я падкрэсліваю: я адной з падзей саміта Усходняга партнёрства лічу сустрэчу Меркель з беларускай апазіцыяй.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

На Пакрову ў Баброўцы

14 кастрычніка ў Зубачоўскім прыходзе вернікі Праваслаўнай царквы адзначалі свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы. У гэты дзень, як на кожным фэсце, побач царквы крамары паставілі латкі з цацкамі ды ўсялякімі смакоццямі. Гэта была сапраўдная „фрайда" для дзетак. Дарослыя ўдзельнічалі ў святочнай літургіі, затым пакарысталіся нагодай для сямейных сустрэч і супольнага застолля. А Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы, супольна з Чаромхаўскай гмінай і Гмінным асяродкам культуры запрасілі жыхароў Баброўкі на беларускі фэст з цыкла „І тут жывуць людзі".

Я забраўся ў Баброўку разам са спявачкамі з вёскі Чаромхі. Падарожжа доўжылася не больш чым дваццаць мінут. Шпарылі мы па шыкарнай асфальтоўцы, пракладзенай яшчэ пры войце Міхале Врублеўскім. Спыніліся перад вясковай святліцай. Да пачатку мерапрыемства заставалася больш за паўгадзіны. Арганізатары запрасілі ў Баброўку мастацкія калектывы. Прыехалі спявачкі з вёскі Чаромхі, гурты „Нарва" і „Арт-Пронар" з Нарвы, „Калінка" з Беластока ды вакальная група з Махнатага. І тут мяне спаткаў мілы сюрпрыз. Сярод удзельнікаў гэтай апошняй групы быў Алёша Герасімюк, які на зломе пяцідзесятых і шасцідзесятых гадоў з'яўляўся членам тадышняга мастацкага калектыву. Абмяняліся мы навінкамі. Паколькі набліжаўся час канцэрта, дык дамовіліся на сяброўскую размову з групай пасля іхняга выступлення.

Першым выступіў калектыў з Махнатага. Хоць самадзейнікі з моманту заснавання групы прэзентаваліся толькі чацвёрты раз і моцна хваляваліся, публіка ўзнагароджвала іх кожны нумар бурнымі апладысментамі. Гэта заслуга мастацкага кіраўніка і акампаніятара Пятра Скепкі. Варта адзначыць, што зала была запоўнена па берагі. Прыйшлі не толькі мясцовыя жыхары. Сярод публікі прыкмеціў я знаёмых з Чаромхі-Станцыі ды навакольных вёсак — Зубачоў, Вулькі-Нурэцкай, Беразышчаў, а нават Ставішчаў і Кузавы. Авацыйна публіка прымала выступленні гуртоў „Нарва" і „Калінка" ды „Арт-Пронар". У Баброўцы на Пакрову царыла беларуская песня і музыка. Канцэрт доўжыўся больш за дзве гадзіны і вельмі спадабаўся гледачам.

— Вось, гэта канцэрт!.. Такіх бы нам больш, — паўтараў сядзячы побач мяне Сярожа Рожук.

Імпрэза была вельмі ўдалай. Выступаючым калектывам, як і арганізатарам належыцца „пяцёрка з сонейкам" разам з падзякай і спадзяваннем, што такія беларускія фэсты з народнымі песнямі будуць часцей арганізавацца ў Чаромхаўскай гміне.

Пакідаў я імпрэзу ў поўным разгары, калі на сцэне выступаў гурт „Арт-Пронар". Цудоўна спявалі. Малайцы! А вяртаўся я дамоў у ранейшай кампаніі — са спявачкамі з вёскі Чаромхі, якія, прыносячы асалоду ў падарожжы, выканалі на развітанне некалькі песень з маёй маладосці. Гэта быў для мяне сапраўды цудоўны святочны дзень!

Уладзімір СІДАРУК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

У чацвёртым „а” разумеюцца без слоў!

Толькі з табою мне хочацца жыць, толькі з табою! — пачулася на развітанне ад дзяцей з чацвёртага „а” класа. Песеньку заспявалі жулікаватыя хлапчукі. Мы адразу здагадаліся, што ў класе слухаюць *Падляшскі канцэрт пажаданняў*. А яшчэ „Зорка” прывезла падарункі ад рэдакцыі Радыё Рацыя.

Раней мы гутарылі пра беларускія словы. Пра дзіўнае слоўца „сюрпрыз”, з якім мяне сустрэлі ў класе.

— Хто ведае што значыць слова „сюрпрыз”? — спытала спадарыня Валя Бабулевіч. Па класе пайшоў шумок. Здавалася, што не будзе ніякай праблемы з адказам. Вучні, навыперадкі, хацелі адказаць на пытанне. І кожны адказ выклікаў многа смеху:

— Гэта госць?

— Не, гэта коцік!

— Можа... прыгода?

— А можа так называецца беларуская газета ...

Пасля, калі мы падказалі, што той „сюрпрыз” гэта нечаканы падарак, ад якога ўсім весела і добра, дзеткі яшчэ больш павесялелі. І пачалі распавядаць пра сваіх класных жартаўнікоў. Дзякуючы ім у класе не бывае сумна. Мова пра Кубу і Давіда, якія заўсёды гатовы развесяліць кампанію. Нават тады, калі вымоўна маўчаць.

— Куба, скажы штось смешнае! — настойвалі сябры.

— А так на *паважна*? — спытаў сур'ёзна хлапчук.

У адказ успых громкі смех, быццам тут і не чакалі другога адказу.

Пра свой вясёлы клас распавяла нам Магда Дунікоўская. Гэта яна першая прыкмеціла, што ў школе іх лічаць сяброўскім класам.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

— У класе ўсіх дваццаць шэсць вучняў, а нашай выхавацелькай з'яўляецца спадарыня Зофія Сачко, — кажа Магда. — Многія выступалі ў конкурсе „Роднае слова”.

У час сустрэчы аказалася, што дзеці проста абажаюць слухаць жывыя апавяданні на беларускай мове. Любяць рашаць конкурсы пра беларускія абрады, гарады і пісьменнікаў. Мяне асабіста здзівіла пытанне пра месца знаходжання нашай рэдакцыі.

— А пані то прыехала да нас з Масквы? — спытаў мяне цалкам сур'ёзна адзін хлопчык.

Калі аказалася, што рэдакцыя ў Беластоку, навіну ўспрынялі як той сюрпрыз і паабяцалі стаць нашымі вернымі чытачамі. А пасля найбольшыя жартаўнікі прыгожа зацягнулі „Толькі з табою”!

ЗОРКА

Віталь ВОРАНАЎ

Раз, два, тры, чатыры, пяць

Кожны жэўжык мусіць знаць,
Як на пальцах рахаваць.
Адзінец — ён першы палец
Ці інакш — вялікі палец.
Вось паказнік, цап і знік,
Ён другі, а разам з ім,
Пасярэдзіне, як зэдлік,
Трэці ўжо стаіць сярэднік.
Вунь чацвёрты удалец,
Не іначай — персцянец.
У канцы там на мяжы,
Пяты мезенец малы.
Ведае ўжо ўся малеча,
На руцэ лічыць — прастэча!
Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Пальчыкі кладуцца спаць.

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны Кандрацюк

1. Імя і прозвішча: Крыстыян Паскробка (ПШ у Нарве).

2. Твой любімы прадмет: матэматыка.

3. У жыцці хачу стаць: паліцыянтам.

4. У сяброў цаню: весялосць і дабрыню.

5. Не люблю: калі хто прымяняе насілле і агрэсію.

6. Па-беларуску размаўляю: з мамай і татам.

7. Кніжка, якая мяне захапіла: «Акадэмія пана Клекса» Яна Бжэхвы.

8. Падабаецца мне музыка: «руская».

9. Твае ўлюбёныя стравы: гарохавы суп, які гатуе мая мама.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: люблю катацца на роварах.

11. Калі дарасту хачу жыць: яшчэ не думаў пра гэта.

Вершы Віктара Шведа

Чыя цяжэйшая мова?

— Цяжкая нашая мова,
Англічанін адзываецца.
Shakespeare пішацца слова,
А Шэкспір чытаецца.

— А нашая, паляк адказаў,
Яшчэ больш вар'яцкай.
Пішацца Прус Баляслаў,
А чытаецца Аляксандр Главацкі.

Хто больш любіць войска?

Азвалася маці: — Сынок
Бывае ў сям'і геройскі.
Мінае дваццаты гадок —
Гдзе з ахвотаю ў войска.

А бацька зрабіў тут намёк:
— Гаворыцца часта ў народзе —
Калі мы маем дачок
Дык войска да іх прыходзіць.

У беларускім класе ў Нарве...

... ёсць адна насценная газета. На ёй фельетоны, інтэрв'ю, вершы і апавяданні сяброў Сустрэч „Зоркі". Між іншым фельетон „Вялікая вада і чалавечае гора" Міхаліны Герасімюк (белліцэй у Гайнаўцы), фельетон Паўліны Ваўранюк „Ці бачыш як церпіць рака" (гімназія ў Нарве), фельетоны мясцовай гімназісткі Улі Беразавец „Джазмен Леў з Ляўкова" і „Музыка жыцця". Ёсць таксама інтэрв'ю з выпускніцай нарваўскай гімназіі Касяй Сянкевіч і яе верш „Па паверхні неба". Кася завітала на Сустрэчы разам са сваім новым зборнікам вершаў „Дачка ружы". Ад спаткання з паэткай і студэнткай мастацтва асталося цікавае інтэрв'ю „Я бачу свет як карціны", якое ўзялі яе малодшыя сяброўкі Дар'я Вапа і Кінга Бадавец. Важным дадаткам тут з'яўляюцца каляровыя здымкі і інфармацыя пра падзею...

Прыемна і цікава прачытаць і паглядзець падборку журналісцкіх і мастацкіх твораў на роднай мове. Тым больш, калі творчасцю моладзі ганарацца ў сваёй школе і прапануюць іх як узор для пачаткоўцаў і малодшых сяброў.

(гак)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паўліна Ваўранюк і Уля Беразавец з настаўніцай Нінай Абрамюк

Музыка з кайфам

Быць і слухаць — „Барды" ў васемнаццаты раз

Можа і „бардаўскую восень" у сёлетняй кастрычніцкай „Музыцы з кайфам" абмінула б, калі б не факт, што арганізатару гэтага фестывалю споўнілася дваццаць гадоў. Час і месца тады, каб успомніць пра музычныя дасягненні Звязу беларускай моладзі.

У 1994 годзе, калі з'явіўся на Падляшшы новы фестываль, энтузіязм быў сапраўды вялікі. У Бельску-Падляшскім, дзе прайшлі першыя канцэрты, на другі выпуск спадзяваліся не толькі маладыя арганізатары, але таксама публіка і мясцовыя ўлады. З 21 па 23 кастрычніка пройдзе ўжо васемнаццатае па ліку мерапрыемства, якое мае пару характэрных рысаў. Першая — гэта напэўна атмасфера, якую трэба адчуць самому. Крыху восеньскай задуменнасці, крышынка настальгічнасці, жменька аптымізму і цэлы залій сяброўства. Другая — асаблівыя графічныя выявы фестывалю, якімі раней займаліся сябры Звязу, а зараз ужо пару гадоў запар рыхтуе іх знакаміты сябра „Бардаўскай восені", дызайнер, паэт, мастак Міхал Анемпадыстаў. Трэцюю рысу выварожыў яшчэ ў час першага фестывалю беларускі дзеяч Пятро Багроўскі. Перад камерай, якая запісвала тады эмоцыі пасля канцэртаў, распавёў ён пра ідэю „беларускай восені" — канцэртаў, якія павінны разліваццa па цэлай Беласточчыне, ад Дубіч па Гарадок. У Дубічы-Царкоўныя папулярныя „Барды" яшчэ не завандравалі, але на канцэрты, нават сёлета, можаце трапіць у Бельск, Гайнаўку, Тэрэміскі, Шчыты, Гарадок, Беласток. А ўсё ўжо ў бліжэйшы ўікэнд.

Каб расказаць пра іншыя музычныя падзеі ЗБМу, трэба пачаць з Купалля, якое праходзіла ў Нарве з 1995 па 2000 год. Гэта было зусім іншае мерапрыемства, чым тое, якое ведаем з Белавежы. Перш за ўсё ў музычным плане, бо можна было там сустрэць побач фольк-гуртоў таксама рокменаў у асобах Касі Камоцкай ці Лявона Вольскага і праектаў з імі звязаных. А перад сцэнай тоўпілася куча небанальных маладых людзей.

Былі і спробы клубнай канцэртнай дзейнасці. Найцікавей разгортвалася гісторыя „Зімовых музычных сустрэч" у Беластоку, але натуральна неяк гэты цыкл знік, калі Звяз пачаў

ангажавацца ў праекты іншага кшталту. А захоп Беластока лепш удаўся ў выглядзе канцэртаў на Польскім радыё Беласток і ў Беластоцкім лялечным тэатры.

Ёсць і вынікі ў выдавецкай галіне. За дваццаць гадоў з'явіліся тры дыскі з лагатыпам ЗБМ. Першы — гэта ўспамін з „Бардаўскай восені" 1998 года, другі — пасля 10 гадоў, а трэці ў мінулым годзе пад эгідай Звязу запісаў гурт „Ilo&friends". Быць і слухаць — гэтага чакаюць ад нас нязломныя арганізатары.

i_basovka@o2.pl

Конкурс пра восень (4)

Прывітанне сябры! У нас працяг восеньскага конкурсу. Частку адказаў падкажа вам каляндар „Нівы", які напэўна ёсць у вашай хаце або школе. Сярод прапанаваных варыянтаў пазначце правільныя адказы:

1. Калі ў Рэспубліцы Беларусь адзначаюць Дзень Маці?

а) 26 мая,
б) 1 студзеня,
в) 14 кастрычніка.

2. Хто з выдатных беларусаў Падляшша, прадстаўленых у ніўскім календары на 2011 г., нарадзіўся ў месяцы кастрычніку:

а) Іван Краскоўскі,
б) Сяргей Дубінскі,
в) Яраслаў Кастыцэвіч.

3. Хто з выдатных беларусаў Падляшша, прадстаўленых у ніўскім календары на 2011 г., з'яўляецца патронам Комплексу школ № 3 у Бельску-Падляшскім?

а) Мікола Чарнецкі,
б) Ян Тарасевіч,
в) Яраслаў Кастыцэвіч.

4. Хто з выдатных беларусаў Падляшша, ураджэнец Дубіч-Царкоўных, прадстаўленых у ніўскім календары на 2011 г., пераклаў на беларускую мову трагедыю У. Шэкспіра „Гамлет"?

а) Аляксей Грыцук,
б) Іван Краскоўскі,
в) Яраслаў Кастыцэвіч.

5. Які колер спалучаем з месяцам кастрычнікам?

а) ружовы,
б) залаты,
в) белы.

Адказы дасылайце да 30 кастрычніка 2011 г. (найлепш па электронай пошце на адрас „Зоркі"). Тут разыграем цікавыя ўзнагароды — беларускія кніжкі і гульні.

Адказ на восеньскі конкурс № 3: *1 — ад кастрыцы, 2 — Пакровы, 3 — Анатоль Сыс, 4 — Шалі, 5 — у гміне Орля.* Узнагароды, ***фота-альбомы „Ландшафтныя паркі Падляшша"*** выйгралі **Аляксандр Данільчук** і **Дыяна Галёнка** з Бельска-Падляшскага. Віншуем! Наш спонсар: Сувальскі ландшафтны парк.

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 43

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 39:

Там, аса, поспех, струк, мак, ява, до, дар, князь, гук, пас, раяль. Смага, парус, так, ар, Ян, свята, таз, суд, акорд. Унагароду, кніжку „Адукацыйныя вандроўкі па ландшафтных парках Падляшша", выйграў Рафал Вакулюк з Гайнаўкі. Віншуем!



Віктар ШВЕД

Тут я ўжо дома

Пятру Сэльвесюку

Калі быў хлапчуком вясковым
І жыў у родным наваколлі,
Вучыўся пільна польскай мовы
У даваеннай гміннай Орлі.

І пісаў вершы ў мове гэтай.
Прыемна ўспомніць тую хвілю,
Што ўпершыню мяне паэтам
У сямігодцы „ахрысцілі".

У беларускай школе потым
Вучыўся ў Орлі я таксама
І мову родную з ахвотай
Я прагна вывучаў з сябрамі.

І з нізкай беларускіх вершаў
— Якая ж гэта была радасць! —
Быў скіраваны раз найпершы
Школай у Бельск на алімпіяду.

Мне, беларускаму паэту,
Надта прыемна. Вам падзяка!
За ўстаноўку важных гэтых
Двухмоўных указальных знакаў!

Ці дажыву тае хвіліны?
(Можа знаходзіцца ў праграме?)
Калі мая, Чыжоўска гміна,
Будзе двухмоўнаю таксама?

Беласток, 09.10.2011

Чаромха з акна цягніка ў 1932 годзе

Д-р Казімеж Вадзіцкі (1900-1987), польскі заолаг і арнітолаг, атрымаў у 1932 годзе дазвол на адстрэл для навуковай мэты 3 глушцоў на тэрыторыі Свіслацкай пушчы. Пры нагодзе наведаў і Белавежскую пушчу, у саставе якой уваходзіць зараз тая першая. Вучоны свае ўражанні ад паездкі апісаў і апублікаваў у львоўскім часопісе для паляўнічых „Łowiec". Я выбраў для чытачоў „Нівы" фрагмент, які аўтар прысвяціў Чаромсе, праз якую праязджаў цягнікам, дабіраючыся ў пушчу:

„Wjeżdżamy do Czeremchy. Próżno jednak podróżny w czasie dość długiego postoju rozgląda się za tą upojną swym zapachem rośliną; gorzej, bo oko poza kilku stereotypowemi domkami kolejowemi nie widzi nic poza mszarem pokrytym zrzadka usianemi drzewami, pełnemi jakiejś melancholji i opuszczenia, jak ta wielka węzłowa stacja w nowym wspaniałym dworcu, którego pozazdrościćby mogło niejedno nasze wojewódzkie miasto. Uprzejmi towarzysze (w III klasie w jej wspólnym przedziale istnieje zawsze coś w postaci komuny), objaśniają, że najbliższa sadyba ludzka, a mianowicie miasteczko Kleszczele, jest o 10 „wiorst". Zapewne i tu jakaś fantazja nieznanego na szczęście dla nas petersburskiego potentata kolejowego kazała ten wielki węzłowy dworzec budować w lesie naprzekór jemu i ludziom miejscowym".

Пётр Байко

— Ужо 13 гадоў я не ладзіў фотавыстаўкі ні ў Гайнаўцы, ні ў іншых мясцовасцях, толькі прэзентаваў здымкі ў галерэі, якую наладзіў у будынку на сваім панадворку (пісаў я аб гэтым гадоў сем назад — А. М.). Ідэя арганізаваць выстаўку ў Педагагічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы ўзнікла нядаўна. Але ўжо тры гады я рыхтаваў цікавейшыя фатаграфіі для публічнай прэзентацыі. Спачатку думаў паказаць свае здымкі ў ратушы ў Бельску-Падляшскім, але ўсё ж такі рашыўся на Гайнаўку, — заявіў гайнаўскі фатограф-мастак Уладзіслаў Завадскі, які ў мінулым супрацоўнічаў з „Нівай", а яго фатаграфіі красаваліся на старонках нашага тыднёвіка.

фота Ірэны Пракапюк

З Уладзіславам Завадскім у Педагагічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы (на другім плане яго выстаўка) спаткаліся вучні Гімназіі № 2 у Гайнаўцы

Аляксей МАРОЗ

Мастацкія здымкі Уладзіслава Завадскага

Хаця ад нейкага часу не паказваў ён здымкаў па-за сваёй галерэяй, не спыніў фатаграфавання. Зараз фатограф ездзіць па вёсках Гайнаўшчыны, наведвае Белавежскую пушчу і ўсё фатаграфуе. Пры дапамозе лічбавай камеры стараецца запісаць шэдэўры нашай вясковай архітэктуры, увекавечыць цікавейшыя моманты ў жыцці прыроды. Запісанае захоўвае ў выглядзе кароценькіх фільмікаў. Гайнаўскі прафесійны фатограф Яраслаў Схабоўскі лічыць, што здымкі Завадскага асаблівыя і станоўча вылучаюцца на фоне прац іншых фатографаў Гайнаўшчыны.

Уладзіслаў Завадскі ўмее знайсці цікавыя аб'екты для фатаграфавання і цікава зафіксаваць вясковы клімат з мінулага, ці асаблівую прыгожасць акружаючай прыроды. Вельмі арыгінальныя ў яго здымкі каплічак, крыжоў, драўляных хат, клуняў, ці партрэты вясковых людзей, выкананыя яшчэ на чорна-белай плёнцы. Многія людзі, якіх ён фатаграфаваў, адышлі ўжо з жыцця, многія фатаграфіі згубіліся, таму спадар Завадскі лічыць, што трэба спяшацца, каб паспець увекавечыць прынамсі даўнюю архітэктуру, а ў шырэйшым маштабе — нашу беларускую традыцыю і культуру.

— Выстаўка маіх здымкаў у Педагагічнай бібліятэцы накіраваная перш за ўсё да нашых настаўнікаў і вучняў, найчасцей выхадцаў з вёсак, якія я фатаграфую. Хаця загаловак выстаўкі „Па-над полем, па-над лесам...", то прэзентаваныя на ёй фатаграфіі ў многіх выпадках тычацца беларускасці і праваслаўя. Наўскос ад бібліятэкі распаложаны ж белліцэй і белгімназія і настаўнікі беларускай мовы могуць выкарыстаць асаблівы характар маіх здымкаў у час заняткаў, — сказаў Уладзіслаў Завадскі.

На выстаўцы прэзентуюцца перш за ўсё прыгожыя пушчанскія і прыпушчанскія краявіды і вясковая драўляная архітэктура — царква ў Новым Беразове, хаты і клуні. Аўтар здымкаў асаблівую ўвагу звярнуў між іншым на ўнутраныя і вонкавыя дэталі гэтых аб'ектаў.

— Дрэва расце, зрэзваюць яго і робяць з яго крыж, хату, ці клуню. На маіх фатаграфіях можна ўбачыць дрэва круглае, чэсанае і пілаванае, а таксама вонкавы выгляд нашых хат і іх інтэр'ер, — заявіў фатограф-мастак, гаворачы пра традыцыйны выгляд хат у Пасечніках, Навасадах і іншых вёсках. Найчасцей дамы ставіліся ўпоперак да вуліцы, ад дарогі не было вокнаў, а за вялікім пакоем знаходзіліся кухня, сені, а за імі дзве каморы — адна для захоўвання харчоў, другая — для збожжа.

— У больш адлеглым мінулым не было шматлікіх аздабленняў на хатах, якія ёсць цяпер. Іх узоры часта былі прывезены нашымі людзьмі з „бежанства". Навугольнікі ў нас былі даволі простымі, а іх задачай было ахоўваць спалучэнні круглякоў ад дажджу і снегу, каб не нішчэлі. Часта навугольнікаў не было ўвогуле. Я найахвотней фатаграфую хаты ці клуні, якіх выгляд як мага найбольш набліжаны да выгляду з далёкага мінулага. Гледзячы на фатаграфіі дрэўляных аб'ектаў няма чаго саромецца, бо гэта ж нашая традыцыя, — сказаў Уладзіслаў Завадскі.

На выстаўцы ў бібліятэцы многа такой старой забудовы. На адно з дыляў у клуні сфатаграфаванай у Дашах аўтар знайшоў разны герб „Пагоня" і надпіс: 1774 год. Мабыць, гэтая дыля знаходзілася раней у доме, уласнік якога мог быць шляхціцам.

— На месца, якое я хачу сфатаграфаваць, часам прыязджаю многа разоў, каб знайсці самае лепшае асвятленне для фатаграфаванага аб'екта. Аднак бывае і так, што выпадкова ўдаецца зрабіць удалы здымак. Так было, напрыклад, з бярэзінай (здымак паказваецца на экспазіцыі — А. М.), якую я сфатаграфаваў непадалёк ад Істока ў Дубіцкай гміне. На маіх здымках сонца часта коўзаецца па дылях хат або па дрэвах, што робіць здымкі вельмі цікавымі, — сказаў фатограф. — Вельмі цікавыя клуні можна было сфатаграфаваць у Дашах, але апошнім часам яны таксама паднішчэлі. Самая цікавая дашоўская клуня гэта шэдэўр драўлянай архітэктуры, дзе ў шчытовай сцяне вельмі ўдала спасаваныя крывыя дылі, якія робяць гэты аб'ект вельмі займальным для фатографа, асабліва пры раннім асвятленні. Пасля смерці яе ўласніка клуня пачала зарастаць травой і зеллем, што зрабіла гэты аб'ект менш прывабным для фатаграфавання. Трэба спяшацца, каб зафіксаваць такія старыя аб'екты.

Уладзіслаў Завадскі наведвае з фотаапаратам цікавыя, але адначасна малядаступныя месцы Белавежскай пушчы

Уладзіслаў Завадскі дзеля фатаграфавання выязджаў таксама за ўсходнюю мяжу.

— Думаў я абфатаграфаваць таксама вёскі ў Беларусі, непадалёк ад Высокага, але там традыцыйная забудова ўжо знішчана. У вёсках, жыхары якіх працавалі ў калгасах, не знайшоў я клуняў, а тамашнія хаты збудаваныя паводле гарадскіх традыцый, часта прыкрытыя шыферам. Я быў расчараваны тамашнім разрывам з традыцыяй. Даўняя архітэктура можа захавалася ў больш адлеглых ад гарадоў вёсках Палесся, — сказаў Уладзіслаў Завадскі.

Фатаграфуе ён таксама палі, калі знаходзяцца на іх цікавыя аб'екты.

— Вельмі цікава прэзентуюцца на здымках адзінокія дрэвы на палях, на падставе якіх сяляне ў мінулым шукалі сваіх вузкіх палосак (такое дрэва паказваецца на выстаўцы — А. М.). Пазней гэтыя адзінокія грушы ці яблыні сталі высякаць і зараз захаваліся толькі ў тых месцах, дзе не перашкаджалі сельскагаспадарчай тэхніцы, — расказваў Уладзіслаў Завадскі.

Фатограф у 2005 годзе купіў сабе якасны лічбавы фотаапарат, што папраўвіла якасць здымкаў

— Фатаграфіі робленыя добрымі лічбавымі фотаапаратамі намнога больш якасныя ў параўнанні з традыцыйнымі здымкамі. Фатаграфуючы інтэр'ер будынкаў можна ўлавіць больш цікавае асвятленне, — лічыць Уладзіслаў Завадскі.

На яго фатаграфіях многа вясковай беларускай атмасферы з мінулага, якая гіне на вачах, так як тыя ветракі, якія ў прошлым красаваліся побач сёл, а цяпер стаяць толькі ў скансэнах.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Чартоўскае пітво

На абодвух баках палявой дарогі калыхаліся на чэрвеньскім ветры высокія травы, папярэшчаныя квеццем. Аўтамашына аб'язной крамы гайдалася і падскоквала на выбоінах, а ў салоне макрэў расчырванелы Красны Рыгор. Рыгор змахнуў са свайго пукатага з залысінамі ілба тое, што магло быць краплістым потам, калі б было, спрацаванага чалавека ў полудзень у летнюю пару. Кроплі аддалі перагарам. Запахла не спаленым, ды гаручым.

З боку дарогі з разнатраўя шугануў чорны кот. Кот нават не зірнуў на ўздымаючы пыл „люблін". Не цікавіў яго ні Рыгор, ні тавар, які той вёз у гэтым „любліне", а нават і драбніца, што гудзела ў траве. Што там якая мыш ці машкара! Кот Васіль Шарсцюк не паляваў сёння. Яго ў прыполе прынесла баба Жэнька, што схавала сваю гарбаценькую постаць сярод зеляніны. Баба Жэнька цікавала ўжо здаўна за Красным Рыгорам, хоць па прыездзе „любліна" можна было звяраць гадзіннікі. Ды баба Жэнька прыйшла сюды не па пакупкі, хоць у яе вялікай абвіслай кішэні курткі пукаціўся кашалёк. Баба Жэнька прынесла Васю Шарсцюка, каб пусціць яго перад „люблінам". Баба Жэнька шкадавала сваю вёску Хваёвае, у якой жыла ўжо 97 гадоў. Засцерагала яе ад рознай чартоўшчыны яшчэ здавайны. Ратавала сяло ад усялякіх аканомаў, аднавіцеляў, камуністых і антыкамуністых, галандскіх кароў, бройлераў і штучных квактух, ад граду, залеў і ўсушша. А Вася Шарсцюк, у яе ўжо семнаццаты, дапамагаў ёй у гэтым усім, як мог. Зусім не па просьбе ці па ласцы. Проста ведаў сваё чарнашэрснае заданне і вёска Хваёвае спакойна чыпела пасярод лугоў і пушчанскіх узлескаў. Дарога ў апошні час ішла ў адзін бок з гэтага Хваёвага. Вяртаўся сюды мала хто. У апошні час зачасцілі госці, якім даспадобы было салодкае і кіслае малако ды сыр тутэйшых непародзістых кароў, яйкі ад шэрапёрых нясушак, а баба Жэнька асацыявалася ім толькі з харошымі настойкамі на травах. А ката Васю Шарсцюка-Семнаццатага нават не прыкмячалі. Больш дапытлівыя журналісты, калі трапілі ў гэтае старонне, лічылі коней, авечак і кароў на пальцах сваёй адной рукі, а звычайныя турысты цікавалі за лепшымі хатамі, у большасці ўласнасцю жыхароў сучасных магілак, уквечаных штучнымі пякнотамі.

— Не пайду! — у гэты раз Вася Шарсцюк узбунтаваўся. — Без асекур-р-р-рацыі не палезу на р-р-р-ражон.

Ды выхаду не было, баба Жэнька ўхапіла Васю за каршэнь і шпурнула на дарогу. Вася дзыгануў без аглядкі на пыл дарогі і аж зачхаўся. Адчуў на сваёй выгібастай спіне штосьці як пякучы стрэл. Гэта спачыла на ёй у адну драбіну імгнення зялёнае вока Краснага Рыгора. Вася ўсёй сваёй кашэчай моцай адбіў прамень злога вока, ушчаперыўся кіпцямі за спечаную зямлю. Ух, пайшло-о-о-о! З-пад падушачак Васевых пальцаў задымілася. Быццам перуновым токам сцебанула Шарсцюка, убіла яго ў глебу. Страпянуўся, здрыгануўся, і ледзь ачомаўся. У галаве мільганула адно: „Як найхутчэй дахаты!". У склеп залезці, у цемру! І ад Краснага ўцячы, і ад бабы Жэнькі, каб не ганяла па сваіх чарадзейскіх справах. А то з кагосьці ляк выганяе: „Ідзі, ляк, на чорны лес, дзе птушкі не пяюць і зверы не ходзяць!" — а там Вася чагосьці якраз шукае!.. І той ляк налятае і між сухімі дрэвамі сунецца, і ў кацінную душу, што ў ім жыве, уціснецца! А потым шукай ты, баба Жэнька, свайго беднага чорнага семнаццатага ката!..

Баба Жэнька перажагналася, плюнула праз левае плячо і амаль на карачках пасунулася да мяжы, на якой стаяла старая груша. Вось гэтая груша была старэйшая і за бабу Жэньку.

Красны Рыгор вёз у вёску атруту. З яе меў грошы, каб за іх набыць яе яшчэ больш, ды не самай лепшай. Атрута, калі яе піць, патрабуе за кожным разам усё большай дозы, неабавязкова лепшай якасці. Атруту мералі па аб'ёме, не ўзважваючы яе на шалях. Атрута была вадкасцю, так як і большасць рэчываў, з якіх складваецца матэрыяльнае цела чалавека, ды называлі яе чамусьці духоўна: „Спірытус"! Хоць і з чыстым спіртам мела яна невялікае дачыненне.

— Цьфу, нячыстая сіла! — баба Жэнька нюхнула паветра. Сярод духмянасцей чэрвеньскага лета ўчула перагар, які біў ад постаці Краснага Рыгора, не толькі з яго ротавай поласці, з якой не спускаў сваёй ухмылкі зажытачнага гаспадара. — Яшчэ б Васю не пашкодзіў! Коцік справіўся і з несумленнымі землямерамі, і са старшынёй калгаса, і з сышчыкамі якіх хочаш паліцый. Толькі ў партызанах не вельмі разбіраўся, як і сама баба Жэнька. Ці то „чырвоныя", ці „зялёныя", ці „чорныя", ці рабыя, — ніколі не было часу ў іх пытацца, адкуль яны і чаго хочуць. А хацелі толькі аднаго: узяць не сваё. Дасі ці не дасі, лепш даваць драла ў лес самому. Кожнаму важнейшая ўласная скурка! Калі жывеш на мяжы, азірайся па баках.

А тут той Красны Рыгор вязе атруту па памежжы. І ведае ў каго за паваротам у сасмаглую глотку ўліецца тая атрута, як у прорву. Паглыне чалавек атруту, і атрута паглыне чалавека, спаліць яго думкі, душу і цела. І стане чалавек як гэтыя выпетраныя паскі зямлі шостага класа, дзе нішто не хоча вырасці. Дзе не ўтрымацца расліне, каб запусціць карэнне ў глыбінныя нетры зямлі. А туды дастанецца не кожны! Які трэба мець моцны корань, каб трымацца зямлі!

Баба Жэнька, стомленая ад дзеянняў, якія чыніла ўжо трое сутак, пачаўшы ад модлаў на Белым камені звечара, як пачаўся Дзень першы, прысела пад дзіваннамі. Выцерла ўпацелае перааранае маршчынамі чало хустачкай. Дзіванны-дзіўныя панны схілілі ў здзіве свае залатыя галовы: на хустачцы бабы Жэнькі зачырванеў мак! Расклала баба Жэнька хустачку на траве: з яе ўзіраўся плямісты твар, зусім як у старым вершыку: кропка, кропка і выклічнік — вось і выйшаў ганавічнік! Зусім не сімпатычнае аблічча!

Бабе Жэньцы стала блага. Укленчыла пад дзіваннамі, з торбачкі дастала бутэльку з-пад кока-колы з напарам. Адвінула слабеючай рукою горлечка, глынула цудадзейнага напою. З горла бутэлькі ўзвілася хмара пары.

— Пара, пара, ідзі ўгару, упадзі горкай кропляй на няўрадлівую зямлю, дзе чэрвя няма, і скуль каменне нават не нараджаецца.

Ды злыдух не ўзвіўся вышэй, а расснаваўся вакол бабы Жэнькі і ўдушліва стаў уціскацца ў яе дых.

— Вася, Вася! — ледзь прашаптала бабуля, ды кот учуў яе стогн. Заварушыліся травы і кветкі, выдзыгнуў адтуль Вася і са злосным вуркатаннем і шыпеннем кінуўся на страшную пару. — Кыш! Кыш! Кыш! — заверашчаў пагрозліва Вася і стаў біць паветра ашчаперанай лапай. — Ай!

З хмаркі па кашэчых лапах сталі біць іскры маланак.

Усё сціхла. Вася лёг побач бабы Жэнькі, што пакацілася на мураву, прымяўшы сваім кволым целам куколь, лебяду і валошкі. Абое заплюшчылі вочы.

— Меў бы я прапанову, — мяўкнуў Вася. — Мо хопіць нам змагацца з нячысцікамі? Не ўратуеш таго, хто ратавацца не хоча.

— Можа і годзе, — уздыхнула баба Жэнька. — Але ж праўнукаў шкода, зямлі шкода.

— А колькі нам зямлі тае трэба! А ім, відаць, зусім! А Рыгор атруціць усю рэшту тутэйшых. Што там нам, катам!.. Вернемся ў дзікае становішча. А яны... Людзі... Чаму аддаюць сваё?.. Труцяцца — ну і хай!

І так над прымятай травіцай перакідаліся словам старэчымі галасамі баба Жэнька і кот Васіль. І не ведалі, што Красны Рыгор не жадае пакінуць іх ды іхніх дзеянняў без належнай увагі. І так ужо напсавалі яму крыві сваімі дурнымі чарадзействамі! Не, не на такога трапілі! Спыніў гандляр атрутай свой „люблін" у садку за стадолай на былой гаспадарцы Нічыпара Дулі, а сам пешшу звярнуў на палетак, дзе адпачывалі ягоныя працаўнікі. У руцэ трымаў бутэльку з хітрай наклейкай „Чыстая", ды ў шкле боўталася міла-ружовая вадкасць. У Рыгоравай кішэні пакоіўся кавалачак цялячай каўбасы, а ў другой — торбачка шакаладных цукерак „Беларусские".

Баба Жэнька расплюшчыла свае светла-блакітныя вочы і абыякава глянула на прысеўшага побач Рыгора.

— О, сам чорт завітаў на наш родны загон! — крэкнула ды села. — І чым ты нас спакусіш?

— Не такіх я... спакушаў, — ухмыльнуўся Рыгор. — Частуйся, Жэня, і ты, Васіль, вазьмі на зубок...

Чорт паклаў свой частунак на раскладзеную хустку, якую выцягнуў з рукава.

— Чаго табе трэба? Ніякай атруты з тваіх рук браць не будзем! — усхваляваны Вася стаў біць сябе хвастом па баках.

Ды баба Жэнька наліла сабе ружовага напою ў шклянку, якую чорт дастаў з другога рукава.

— Ну, поўны сервіз, і не з муштардоўкі, і не з пластмасы! — задзівілася старая. — І смак кока-колы! Ці хоць „ляйт" яна?

— Вядома. Я да вас, Жэня, маю просьбу. Не мяшайце мне ў інтарэсах. Хопіць з вас гэтых смешных чарадзействаў.

— Ці ты мусіш гэтым „люблінам" вазіць тую атруту? Сядзіш у тэлевізары, і ў камп'ютары, і ў газеце, і гэтага табе мала? Колькі табе ўсяго трэба? І так намяшаў у мазгах!

— Мушу парадак зрабіць з генатыпам. Калі поўнасцю змяню геном, які даў Госпад беларусам, дык вось тады буду рады. І ўбачыць Госпад, што яны яму не ўдаліся!

— А што — мо ўдаліся? — пырхнуў кот. — Госпаду ўдаліся толькі мы!

— І калі будзе размнажацца мой папсаваны праект, дык урэшце дакажу Яму!

— Размнажацца? Дык як гэта плануеш? Як жа ж яны пладзіцца будуць, па-твойму?

— Нармальна: атручаны мужык з атручанай бабай...

Тут баба Жэнька аж папярхнулася „Чыстай":

— Ну, Рыгор, гэта быццам бы ты сам мне прапанаваў! А адкуль мужыкі баб возьмуць?!

— Вас жа ж будзе ў ваколіцы каля паўсотні!

— Ну і што?

— А кавалераў столькі ж?!.

— От, стары чорце, табе ў вечных ліках тое-сёе паблыталася. Бабам жа ўсім жывым пад дзевяноста будзе, а кавалерам — недзе пад сорак...

— Ну, і што? — Рыгор сам кульнуў шклянку.

— Дык як гэта ўяўляеш? Мо ў прабірцы, такой як твая бутэлечка, будзеш майстраваць свой генатып? — і баба Жэнька паклала ў штучна-белазубы беларускі рот беларускую цукерку.

Вася прыжмурыў вочы з задавальненнем: чорт ад злосці ляснуў пляшкаю ў зямлю, аж адпала донца.

— Дарэмная мітрэнга, Рыгор! Няма чаго гнаць аб'язную краму на гэтыя пяскі. Дарма сюды ходзіш, дарма ножкі б'еш! На чорта табе гэта, гэты дурны генетычны праект! З Госпадам змагаешся ўжо тысячы гадоў. Гэта табе не яблычка даць укусіць Еўцы! Раз табе ўдалося. А на беларусаў няма чаго выцягваць такія гарматы! Гм... а цукеркі „Беларусские" зусім някепскія. Столькі ад іх моцы я адчула ў сваіх членах!

І старая беларуская ведзьма ўхапіла чорта ў свае хударлявыя абдымкі. Прабаваў Рыгор вырвацца, ды цётка кульнула яго ў маладое жыта. Не каштавала ж чыстай атруты, якую чорт вазіў па тутэйшых вёсках. А цукеркі, выробленыя ў „Камунарцы" ў Мінску, не на еўразвязавых штучных кампанентах, — мацату даюць магутную!

Вася заняўся каўбаскай, зробленай у Бераставіцы, таму і смачнай, і карыснай. Пасля пабег у садок і папрабіваў кіпцем шыны ў чартоўскім „любліне". І пад вінт кожнай бутэлькі запусціў свой сталёвы пазур. Цяпер тая атрута, калі выдыхаецца, будзе менш шкоднай, чым прадзіраўлены кандом.

Тэкст і фота Уршулі ШУБЗДЫ

Хто такія „шкаце”?

Калі я апошнім разам гаварыла з маёй бабуляй, (*на здымку*) якая жыве ў Новай Хадароўцы, мяне зацікавіла тое, што яна сказала пра нашую мову. Бабуля ўспамінала, што яе называлі „шкацёўкай”, а мову, якой яна карыстаецца — „шкацёўскай”. Першы раз я ўвогуле пачула такое паняцце. Шчыра кажучы, я была пераканана, што для маёй, ужо даволі пажылой бабулі штосьці перабыталася. Я вырашыла пашукаць у інтэрнэце звесткам пра шкацёў.

Зусім выпадкова я прачытала аб шатландскім насяленні на Падляшшы. Магло б здавацца, што пасяленцы з Шатландыі — на польскай мове *Szkocja* — маглі быць названыя „шкацямі” ў беларускай гаворцы тутэйшых жыхароў. Шатландскае насельніцтва ў Польшчы мае даволі доўгую традыцыю. Людвік Міхал Пац ужо ў XVI стагоддзі прывёў шатландцаў на тэрыторыю Сувальшчыны. Пац з’яўляўся вялікім патрыётам і грамадскім дзеячам. Быў віцэ-прэзідэнтам Таварыства сельскай гаспадаркі. Ён выкарыстоўваў сучасныя спосабы апрацоўкі зямлі, заснаваў фабрыку сельскагаспадарчых машын і абсталявання. Вялікую ролю ў гэтых зменах адыгралі пераселеныя шатландцы і англічане. На Сувальшчыну прыехала іх пяцьдзесят сем’яў. У гэты час вакол сувальскай Даўспуды паўсталі такія вёскі як Шатландыя і Новая Шатландыя, а таксама іншыя гаспадаркі з замежнымі назвамі (Нью-Йорк, Лінтан). Да сённяшняга часу існуюць толькі Шатландыя і Новая Шатландыя, у якіх жывуць нашчадкі шатландцаў.

Але пасля прачытаных звестак і гутарак, якія я правяла з жыхарамі гміны Сухаволя ці Дуброва-Беластоцкая, я была пераканана, што пасяленцы з Шатландыі не маюць нічога супольнага з нашымі „шкацямі”.

Баляслаў Грабінскі, вядомы беларускі палітык і грамадскі дзеяч ваеннага і пасляваеннага перыяду, які нарадзіўся ў вёсцы Урачыншчына (недалёка Дубровы) у сваіх успамінах пісаў:

„Паўночная Сакольшчына (...) была падзеленая вузкою палоскаю лесу на заходнюю ды ўсходнюю часткі. Лес — (...) шматок вялікай Гарадзенскай пушчы — захаваў значэньне падзяляльніка прасторы пушчы на заходнюю ды ўсходнюю часткі, якія гістарычна разьвіваліся ў крыху адменных абставінах. Відавочна, Горадня была цэнтрам для гэтых прастораў, бо запушчанамі зваліся тыя, хто жыў на захад ад пушчы, далей ад Горадні. Хаця ад пушчы засталося няшмат, назоў Запушча перастрываў аж да пачатку XX стагодзьдзя, як і назоў Шкацёў, які запушчане ўжывалі для тых, хто жыў на ўсход ад пушчы. Лес быў дзяржаўнаю собскасьцяй, зваўся ў нас Казённым. Быў ён абкапаны ровам з абодвух бакоў, што зрабілі ў пачатку або ў палове [XIX] стагодзьдзя”.

Паводле вывадаў Баляслава Грабінскага мая бабуля, якая жыве ў Новай Хадароўцы, на захад ад згаданай пушчы, не павінна лічыць сябе „шкацёўкай”, толькі „запушчанкай”. У „мазуроў” — людзей, якія жывуць на поўнач і захад ад рэк Бобры і Бярозаўкі, не было адрознення між „запушчанамі” і „шкацямі”. „Мазуры” ўсіх іх называлі проста „шкацямі”.

— Мой бацька прыйшоў у прымы з Дзенцялоўскіх-Калёніі. Ён быў „мазурам”. Там за ракой, як я зайшла адведаць сям’ю, яны інакш на мяне не назвалі толькі „шкоцька”, — расказала мая бабуля Ірэна Ваверня. — „Мазуры” проста так нас называлі. Яны гаварылі, што яны палякі, у іх Польшча. Было так, што калі мазуры прыходзілі на забаву да нас, то яны заўсёды так смяяліся з нашай мовы, што толькі жываты ім трасліся.

Адно, чаго яна не ведала, самае важнае: адкуль гэтая назва.

Будучы ў Дуброве на пакупках, я вырашыла, што варта падпытаць людзей ці чулі пра „шкацёў”. Каго не запытала, усе са здзіўленнем адказвалі, што першы раз чуюць такое слова. Пачала я думаць, што такая назва існуе толькі ў галовах некалькіх чалавек. Ужо перад самым ад’ездам я загаварыла да старэйшага чалавека ці можа ён чуў пра „шкацёў”.

— А што я ведаю? — пачаў спадар Болек з вёскі Гарасімовічы. — Магу толькі сказаць, што на захадзе было ўжо больш, як яны казалі, культуры. „Шкаце”, як бы ўзяць на рускай мове, ну гэта карова. Магу сказаць як гаварылі людзі. Тут за Дубровай ёсць Новая Вёска. Жыла там такая жанчына, яна мела сына толькі аднаго. Я яго яшчэ помню. Ён паехаў да мазуроў на вяселле. Ну і як на вяселлі селі за стол, трохі выпілі і ў той час такія дзве дзяўчаты смяяліся, што прыехаў з гэтай вёскі, дзе „шкаце”. Ён дастаў з кішэні жменю цукеркаў і пачаў частаваць гэтых дзяўчат. Яны выцягнулі рукі, каб узяць цукерка, а ён паказаў фігу і сказаў: „О, што шкаце могуць! Знайце шкаця!”.

Вярнуўшыся ў Хадароўку, я неадкладна пайшла да бабулі сказаць ёй аб гэтым, чаго я даведалася ад Болька з Гарасімовічаў. Бабуля толькі шчыра засмяялася:

— Чаго я даведалася на старыя лета, што нас параўноўвалі да скаціны.

Такія ці іншыя назвы жыхароў розных тэрыторый ці вёсак характэрныя для беларусаў Падляшша. Парадаксальна адораныя „мянушкай” людзі найчасцей не ведаюць аб існаванні такой назвы і не маюць паняцця адкуль яна ўзялася.



Адной з адметных праяў цягацення да беларускасці ў некаторых прадстаўнікоў таленавітай беларускай моладзі з’яўляецца захапленне сярэднявечнай музыкай. Апошнім часам музычныя гурты, якія граюць так званую беларускую сярэднявечную музыку, перажываюць уздым сваёй дзейнасці — іх выклікаюць на разнастайныя карпаратыўныя вечарыны, яны даюць канцэрты, і нават карыстаюцца папулярнасцю за межамі Беларусі.

Раней у нумары ад 19 снежня 2004 года „Ніва” пісала пра гурт „Стары Ольса” — адзін са знакамітых гуртоў гэтага накірунку. Своеасаблівым канкурэнтам яму можна назваць „Testamentum terrae” („Запаветная зямля”), сайт якога месціцца ў інтэрнэце па адрасе **www.testamentum.net.**

Галоўная старонка сайта гурту выклікае пачуццё таямнічасці — цёмнае дрэва з бачнымі каранямі па задумцы аўтараў сайта мусіць падказваць, што тэма сайта — сівая даўніна.

Сайт „Testamentum terrae” мае тры моўныя версіі — беларускую, рускую і англійскую. Калі параўнаць усіх іх, то будзе заўважна — найбольшая ўвага аўтараў надаецца беларускамоўнаму варыянту.

Варта адзначыць, што пачуццё таямнічасці, якое ўзнікае пры адкрыцці галоўнай старонкі, не пакідае цэлы час, калі карыстальнік знаходзіцца на сайце. Гэтаму спрыяе чорны фон выяўлення і яскравазялёныя назвы старонак. Дарэчы, старонак не вельмі многа — усяго шэсць, але яны дазваляюць скласці аб „Testamentum terrae” больш-менш поўнае ўяўленне.

Праўда, нейкае здзіўленне выклікае першая рубрыка „Падзеі”. Сайт з’явіўся ў інтэрнэце летась, а інфармацыя ў „Падзеях” тычыцца толькі сёлетніх жніўня, верасня і лістапада. Па ўсім відаць, уладальнікам сайта не заўсёды хапае часу на публікацыю навінных звестак пра сябе.

Тое ж самае можна аднесці да рубрыкі „Відэа”, якая хоць і выдатна анансавана, не змяшчае ў сябе аніякай інфармацыі.

Затое старонка „Аб гурце” распавядае многа цікавага. Напрыклад тое, што ўзнік ён ажно ў 2003 годзе і першапачаткова меў назву „Testement”. Яго стваральнік і кіраўнік — майстар народных інструментаў Юрась Панкевіч. „У рэпертуары гурту — беларускія народныя танцы й гульні, балады й рэкруцкія песьні, а таксама папулярныя мелодыі Сярэднявечча. Гурт супрацоўнічае з рыцарскімі клюбамі Беларусі й Еўропы, з музэямі й навуковымі цэнтрамі, з майстрамі старадаўніх музычных інтструментаў, з гуртамі народнай, прыдворнай, духоўнай і гарадской старадаўняй музыкі, з асобнымі выканаўцамі на старадаўніх музычных інструментах. Музыка гурту дазваляе аднавіць гучаньне забытых інструментаў”, — так прэзентуюць сябе музыкі з „Testamentum terrae”.

Праслухаць творы гурту дае магчымасць мультымедыйны складнік сайта. З правага боку месцяцца назвы песень, якія адначасова з’яўляюцца выйсцем на гукавыя старонкі. Яны падаюцца лацінкай. Усяго там месціцца дзесяць твораў, якія выдатна перадаюць уласцівыя толькі данаму гурту асаблівасці гучання.

Цікавай аказваецца рубрыка „Галерэя”. Там прадстаўлены фотаздымкі з разнастайных мерапрыемстваў, дзе граў „Testamentum terrae”. У той жа час сайт не абышоўся без даволі прыкрага недахопу — адтуль мы не даведаемся, хто менавіта ўваходзіць у склад гурту.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ к а р б ы

Сцежкі Ажэшкі

Эліза Ажэшка — асаблівае імя ў гісторыі Гародні і ўсяго прынёманскага рэгіёна. Няшмат у нашым нацыянальным пантэоне асоб, з якіх адначасна могуць браць прыклад і тутэйшыя палякі, і мясцовыя беларусы. І не таму, што нашы ўзаемныя гістарычныя стасункі досыць складаныя, а таму, што пісьменніца Ажэшка была менавіта ўзорам прынцыповасці, годнасці, а таксама сцвярджальніцай рэгіянальнага патрыятызму, прыналежнасці да зямлі, якой варта і трэба ганарыцца.

Адна з цэнтральных вуліц Гародні носіць імя менавіта Элізы Ажэшкі. На ёй стаіць прыгожы дамок пад нумарам 17. Ён пабудаваны ў 1976 годзе з пераносам углыб як копія драўлянага дома, у якім жыла пісьменніца, пераехаўшы сюды і выйшаўшы замуж за Станіслава Нагорскага. Менавіта тут быў напісаны зборнік навелаў „Gloria victis”, многія іншыя творы. Стаўленне жыхароў горада да Ажэшкі найлепш характарызуе наступны факт: калі яна цяжка хварэла, людзі выслалі брукаванку паблізу яе дома саломай, каб не грымелі пад вокнамі колы. А правесці Ажэшку ў апошні шлях прыйшлі тысячы людзей. У 60-я гады дваццатага стагоддзя ў будынку месцілася і гуртавалася аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў, якое ўзначальваў Аляксей Карпюк. У доміку паўсталі музейныя пакоі і размясцілася бібліятэка замежнай літаратуры. Памятаю, як наш універсітэцкі выкладчык гісторыі культуры Барыс Клейн у адным з пакояў выконваў на фартэпіяна для нас творы розных кампазітараў.

Нібы здзек сённяшняй улады над памяццю пісьменніцы назвы крамаў і кавярняў на вуліцы яе імені: „Москва”, „Московский”, „Родная сторона”. Вядома, што Ажэшка цягам свайго жыцця слова не вымавіла публічна па-расейску, а размаўляла па-польску, па-французску і па-беларуску. Праз сто гадоў нашчадкі „мураўёвых” помсцяць ёй за гэта.

Галоўнае ж месца ўшанавання Элізы Ажэшкі — вёска Мількаўшчына, дзе была сядзіба роду Паўлоўскіх і дзе нарадзілася будучая пісьменніца. Менавіта тут у мясцовай школе колішні дырэктар Уладзімір Трахімчык і настаўніца Тацяна Савянкова стварылі музейную экспазіцыю. А на ўскрайку Мількаўшчыны, дзе колішні фальварак Паўлоўскіх, дзе нарадзілася Эліза Ажэшка, расла і куды яна вярнулася пасля паразы паўстання 1863 года, пастаўлены крыж, помны камень, буслянка. Хату выкупіў прадпрымальнік-турэператар, але далей справа пакуль не пайшла. З Мількаўшчыны шлях Ажэшкі вядзе ў Залесна, дзе пахаваныя бацька, сястра пісьменніцы і іншыя яе сваякі. А далей дарога ў маю родную Каменку. У раннім дзяцінстве, гуляючы вакол мясцовага касцёла, я не ведаў, што на гэтай тэрыторыі некалі быў іншы храм, у якім і была ахрышчана дзяўчынка Эліза. На яго месцы зараз помнік з адпаведным надпісам.

Што засталося над Нёманам з часу Пані Элізы, з натуры яе творчасці? Плынь і шум ракі паблізу крыжа Яна і Цэцыліі ў Багатырэвічах, рэшткі падмурка старога лецішча ў Мінявічах, колішні палац Ромераў у Лунне і пахаванне на тамтэйшых могілках роду Камінскіх. Урэшце знакамітыя гербарыі Ажэшкі, якая грунтоўна займалася батанікай. Што засталося з часу на зломе стагоддзяў, у якім жыла пісьменніца? Варта пашукаць... У гэтым пошуку можна запаліць знічку на магіле Ажэшкі, што на старых гарадзенскіх каталіцкіх могілках, паслухаць спеў птушак у Румлёўскім парку, прайсці пад шатамі кляновых прысадаў і напіцца вады са студні-жураўля ў Мількаўшчыне, уклечыць у каменскім храме, праехацца возам праз прыбярэжныя вёскі Мастоўшчыны, урэшце спусціцца стромым берагам да Нёмана і паплыць чаўном...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Васіль САКОЎСКІ

Выбары

Усё ж цікавая рэч дэмакратычныя выбары. І вясёлая. Вясёлая для народа і працавітая для кандыдатаў, але працавітая не ўвогуле, а толькі ў час саміх выбараў. І апошнія выбары ў Сейм і Сенат таксама вясёлыя, гучныя і працавітыя для кандыдатаў. Назіраючы за імі, любуючыся імі, я і падумаў аднойчы: ці ёсць штосьці падобнага да нашых выбараў у нашых меншых братоў з жывёльнага свету, якога ж і мы, людзі, з'яўляемся неад'емнай часткай? І я аж падскочыў ад нечаканасці — канешне, ёсць, гэта ж як піць даць — гон, rykowisko! Ужо тое „рыкавіска", гон, больш праўдзівае, адэкватнае і каларытнае, чым назва „выбары", таму і будзем ім карыстацца.

І так, гэтыя два гоны маюць многа супольнага паміж сабою, маюцца таксама і пэўныя адрозненні паміж імі. Давайце дакладней прыглянемся ім. І ў адным, і ў другім гоне прымаюць удзел як самцы, так і самкі. І ў адных, і ў другіх кандыдатаў маюцца свае пісаныя і цікавыя гонныя праграмы. І адны, і другія вядуць сваю выбарчую кампанію гучна, напорыста, аб чым і сведчыць сама назва мерапрыемства. Даволі важную ролю ў абодвух гонах адыгрываюць таксама сексуальныя аспекты...

І ўсё ж такі ў звярыных гонах больш логікі і дэмакратыі, чым у людзей. І гэта не яны ад нас, а мы ад іх узялі прыклад правядзення дэмакратычных выбараў. Звярыныя кандыдаты вядуць свае выбарчыя кампаніі паводле сваіх цвёрдых праграм і адвечных законаў, якіх моцна трымаюцца. Іх праграмы лагічныя, зразумелыя, чытэльныя. Іх кандыдаты-самцы, напрыклад, вядуць сваю выбарчую кампанію востра, адважна, не шкадуючы ні сіл, ні здароўя, але па-джэнтльменску — і перамагае фізічна наймацнейшы. А іх кандыдаткі-самкі не мусяць нават пацець і высільвацца — усе яны акажуцца запатрабаванымі і будуць дэмакратычна абслужаныя найлепшымі...

Людскія ж кандыдаты гонаў сваім выбарчым праграмам не надаюць большага значэння — свае выбарчыя праграмы трактуюць яе фігавы лісток, і толькі. Лёгка могуць забыцца пра іх, змяніць ці нават адрачыся ад іх, абы толькі дапамагло гэта быць выбраным. Стараюцца яны перамагаць у гонах зашмат не рызыкуючы, бо ні сваёй сілай, ні ўменнем, ні праўдай ці розумам, а хітрасцю. Найчасцей менавіта хітруны становяцца пераможцамі людскіх гонаў. Перамогшы раз, ужо намнога лягчэй перамагаць у наступных гонах. Хітрасцю людскія самцы стараюцца таксама не дапускаць да ўлады сваіх самак...

І апошні, сексуальны аспект, які заўсёды прысутнічае пры розных гонах. Ён таксама выглядае прыгажэй у дзікіх звяроў, чым у нашых выбраннікаў. Звярыныя пераможцы ціхенька зрабілі сваё — і ахвотна гадуюць сваіх звярыных дзетак. А людскія пераможцы на цэлыя гады нарабілі нездаровага сексуальнага шуму, а да сваіх гоначных дзетак ніяк не хочуць прызнацца. Некаторыя сексуальныя аспекты з папярэдніх гонаў яшчэ дасюль не разлічаны...

Наш апошні гон нічым асаблівым не вылучаўся ад папярэдніх. Мноства кандыдатаў і мноства партый прыступіла да яго і як бы ўсе верылі ў тое, што менавіта яны павінны быць выбраны і будуць выбраны. Выбарчыя праграмы ў іх амбітныя, а абяцанні — шчодрыя. Наслухаўшыся такога, проста охнеш. Праўда, охнеш не адразу, а потым, калі яны дарвуцца да ўлады і акажацца, што напляваць ім на ўсе выбарчыя абяцанні і на нас, выбарцаў. Наш апошні гон адрозніваўся ад папярэдніх Янушам Палікотам і яго рухам. Палікот гэта нейкі феномен. Усе ад лева і да права адтрублі ўжо яму за палітычны „ўпакой", а ён як міфічны фенікс адрадзіўся ва ўсёй красе і прыгажосці і пышна расцвіў. У чым жа феномен Палікота?! Палікот відны мужчына, модна апрануты і з прыгожай прычоскай пасля другога прышэсця. Малады, энергічны, смелы, бявіты. Ён ведае слабыя месцы нашай гаспадаркі і дэмакратыі. Востра крытыкуе тыя нашыя заганы, аб якіх палітыкі баяцца нават падумаць. Ён рвецца да ўлады не дзеля паправы свайго матэрыяльнага быту (як іншыя), а дзеля ідэі і можа крыху дзеля самой улады (і гэта лепшае, чым дзеля ўлады і багацця). У яго камандзе няма ніводнага надаеўшага ўжо народу палітыка ці іншага функцыянера. Вось вам і ўвесь сакрэт Януша Палікота.

Беларусы Польшчы і Украіны разам

13 кастрычніка Беларускі дом у Варшаве і Беларускі цэнтр ва Украіне падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. Дамова была падпісана ў варшаўскай сядзібе Беларускага дома.

Супрацоўніцтва двух замежных устаноў „незалежнай Беларусі" будзе грунтавацца на каардынацыі дзейнасці, мерапрыемстваў і праектаў. Сумесная дзейнасць арганізацый будзе садзейнічаць усталяванню трывалых беларуска-польскіх і беларуска-ўкраінскіх адносін і такім чынам паспрыяе наладжванню і пашырэнню польска-ўкраінскіх сувязей па беларускім пытанні.

Ад імя Беларускага дома ў Варшаве дамову падпісалі яго сузаснавальнікі Алесь Зарэмбюк і Зміцер Бародка. Беларускі цэнтр ва Украіне прадстаўляў яго стваральнік Вячаслаў Сіўчык.

Магдалена Вольга АЛЬШЭЎСКАЯ
Беларускі інфармацыйны дом

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Янкі Юхнаўца.

1. старадаўняя колючая зброя, піка = 41 _ 40 _ 39 _ 38 _ 37 _;
2. вышэйшы слой прывілеяванага класа ў буржуазна-дваранскім грамадстве = 2 _ 22 _ 1 _ 14 _ 15 _;
3. адсутнасць вайны = 25 _ 3 _ 4 _;
4. арлекін, блазен = 10 _ 5 _ 20 _ 19 _;
5. частка рачной даліны, якая затапляецца ў час разліву = 36 _ 33 _ 34 _ 12 _ 11 _;
6. многазарадная ручная агнястрэльная зброя з рухомым барабанным магазінам = 42 _ 43 _ 44 _ 45 _ 46 _ 50 _ 32 _ 26 _ 27 _;
7. адкіды, драбяза = 31 _ 24 _ 23 _ 7 _ 8 _ 6 _;
8. Анатоль, беларускі паэт (1959-2005) = 35 _ 28 _ 48 _;
9. левы прыток Прыпяці з Ганцавіч = 29 _ 21 _ 9 _;
10. спакой, цішыня = 49 _ 47 _ 16 _ 17 _;
11. касіў канюшыну = 13 _ 18 _ 30 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 38 нумара

База, бас, брод, веер, воз, газ, гоман, дамба, дзень, дзіця, дым, Заблудаў, зіма, келіх, кілім, меч, Мічурын, мыс, паз, парк, роды, саван, сейбіт, стан, туз, тэст, удаў, цемя, Чавусы, Чорны, чыжык, Чымкент, яслі.

Рашэнне: **Прасякліся з дзяцінства чужым, дурным, атрутным, і хочам мець адзінства у гэтым часе скрутным, і заклікаем-клічам да ўсенароднай згоды — без мовы, без аблічча, без праўды, без свабоды**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Міхалу Байко** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Sprzedaż egzemplarzową „Niwy" prowadzą: kioski i punkty sprzedaży „RUCH" na terenie woj. podlaskiego oraz w Warszawie (odbiór należy zgłosić u sprzedawcy wybranego kiosku lub punktu sprzedaży „RUCH"), placówki pocztowe i listonosze w woj. podlaskim, siedziba redakcji „Niwy".
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.

Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.
Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

23.10 — 29.10

(22.03. — 20.04.) Пры большай дысцыпліне мураваны поспех. 24-28.10. будзеш вельмі паслядоўны, абдуманыя дзеянні, удачы на працы. Спакою шукай у сабе. З 26 (да 30.10.) прадбачваюцца спрэчкі і непаладкі, захавай спакой у дыскусіі, не крытыкуй.

(21.04. — 21.05.) Не ацэньвай нікога па першым уражанні. Найбольш здабудзеш у калектыве. Крыху можа папсавацца здароўе; не натужвайся. 24-28.10. можаш схапіцца за нерэальнае — тваіх энтузіязму і веры можа быць недастаткова. Ды можаш распланаваць сваю дзейнасць на будучыню.

(22.05. — 22.06.) 26-30.10.: стрэсы, спрэчкі і непатрэбнае саперніцтва. На працы пазбягай спрэчак, захавай абачлівасць. Канец тыдня будзе патрабаваць майстэрства ў рэалізацыі фінансавых аперацый, магчымыя кантролі і іспыты, асабліва ў вучняў.

(23.06. — 23.07.) Нішто на павінна табе папсаваць настрою. Калі захварэеш, хутка паправішся. 26.10. засяродзься на адной мэце і без праблем дойдзеш да свайго. Добры час для пішучых дысертацыю. У другой палове тыдня вырашай матэрыяльныя пытанні, падпісвай дамовы. Канец тыдня прыемны ў сям'і.

(24.07. — 23.08.) Да 25.10. будзеш поўны красы і прыцягальнасці, добры час для паразуменняў і негацыяцый. Мноства энергіі, якую разрадзь (калі не — пагражаюць табе гарачка, болі галавы, пераломы, кантузіі). Шукай добрай працы; калі нават не знойдзеш, твае сустрэчы будуць плённыя ў будучыні. З 27 (да 31.10.) не распавядай усім аб сваіх магчымасцях і фантастычных планах.

(24.08. — 23.09.) На пачатку тыдня неабходнасць завяршаць пачатыя справы, што можа выклікаць стому і неахвоту рабіць яшчэ што-небудзь. Скінуць груз стомы паможа нейкае свята, вечарынка. Пад канец тыдня будзеш думаць зноў пра матэрыяльныя справы. Дзеве ў пошуках працы можа ўдацца. З 26 (да 30.10.) будзь халаднакроўным і не рабі нічога сілай.

(24.09. — 23.10.) Будзеш моцна ступаць па зямлі. Прыкладзі ўвагу да ўсяго, што звязана з матэрыяльнымі каштоўнасцямі. За падтрымкай звяртайся да калег і радні. Па магчымасці таксама не адмаўляйся ад дапамогі. 24-28.10. не будзь недалікатным, таўстаскурым.

(24.10. — 22.11.) Праявіш мудрасць і вытрымку, будуць у цябе раіцца, хоць могуць дастаць цябе сваімі просьбамі. Старайся спакойна паказваць свае эмоцыі, асабліва ў канцы тыдня (сур'ёзная сустрэча). Мноства энергіі — выкарыстаеш яе ў працы, у змаганні. Можаш ісці на чаканую аперацыю ці да касметолага. У апошнія дні дакажаш усім, што няма для цябе немагчымага; твае кантакты спатрэбяцца сваякам.

(23.11. — 22.12.) 25-30.10. можаш памайстэрску пераканаць кожнага да ўсяго. Пад канец тыдня адбудзецца нейкая важная сустрэча, не падыходзь да яе легкадумна. Добры час на папраўкі ў хаце, сустрэчы з блізкімі, вяселле. Каханне прыйдзе, калі... перастанеш яго шукаць.

(23.12. — 20.01.) Нагода для наладжання цікавага супрацоўніцтва, не толькі прафесійнага. Знакаміта ў фінансавым плане. Добры настрой, наўкола сімпатычныя людзі. Ды можаш не пазбегнуць складанасцей у здароўі; вельмі добра выбірай лекара, не разлічвай на выпадак.

(21.01. — 19.02.) Вырашальны момант у тваіх справах — злазь з канапы і стартуй з чымсьці новым! 27.10. — рост актыўнасці; будзеш смелы і моцны, пойдзе супер у інтарэсах. Ды 24-28.10. магчымыя сямейныя турботы; не дазваляй іншым вырашаць за цябе.

(20.02. — 21.03.) Некаторыя справы могуць трапіць у тупік; можаш праваронiць шматлікія нагоды, спазніцца на важную сустрэчу, апынуцца не ў тым месцы. Не злуйся, не шукай ворагаў там, дзе іх няма. Да 24.10. можаш добра пастаяць за сваё. Ды 23-27.10. могуць азвацца твае нямогласці, стома і злосць; лепш не ідзі цяпер да дантыста і на аперацыю.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Тэкст і фота Лукаша ЛЕАНЮКА

Зрабілі сцяну. Ні сюды, ні туды не пойдзеш!

Пасля Другой сусветнай вайны мясцовасці на Гарадзеншчыне і Сакольшчыне перасякла польска-савецкая мяжа. Некаторыя вёскі апынуліся па яе абодвух баках. Іншыя, як вёска Хварасцяны ў Навадворскай гміне, першапачаткова апынулася ў Савецкім Саюзе, каб два гады пазней вярнуцца ў Польшчу.

Адным з рашэнняў Ялцінскай канферэнцыі, якая адбылася ў лютым 1945 года, быў дагавор аб выглядзе польска-савецкай мяжы. Мела яна праходзіць уздоўж лініі Керзана, з адхіленнем у некаторых рэгіёнах ад пяці да васьмі кіламетраў у карысць Польшчы. Але канчатковы выгляд мяжы пасля вайны быў усталяваны на польска-савецкіх перамовах у Маскве і зацверджаны 16 жніўня 1945 г. Ад гэтага часу Хварасцяны і навакольныя вёскі, між іншым недалёкія Рагачы, апынуліся ў Беларускай ССР. Гэта аднак не быў канец „вандроўкі" памежных вёсак. Згодна з пагадненнем Польска-савецкай дэлімітацыйнай камісіі ад 30 красавіка 1947 года, Хварасцяны былі вернуты Польшчы.

Але чаму якраз цэлы час згадваю Хварасцяны? У рэшце рэшт на сённяшнім польска-беларускім памежжы ёсць больш вёсак з падобнай гісторыяй. Каб далёка не шукаць, Мінкаўцы, Лапічы ці Грыбоўшчына ў Сакольскім павеце і шмат іншых. Калі паглядзець на карту, можна пабачыць, што каля Хварасцянаў ідзе дарога, якая вядзе з Гродна праз Дуброву, Сухаволю да самага Асаўца. Самая вёска ляжыць з левага боку гэтага шляху, едучы ад Новага Двара. Тут, у Хварасцянах, стаіць польскі шлагбаўм, асфальтаваная дарога вядзе ў нікуды.

— А яшчэ другая мяжа ёсць восемсот метраў далей, больш падрабязная. Там таксама шлагбаўм стаіць. А пасярэдзіне гэтага нейтральная зона і гранічная дарога, — гаворыць Яраслаў Ском'ян, які жыве ў гэтым канцы Хварасцянаў, што знаходзіцца бліжэй мяжы.

— Напрыклад, сусед калісь пераехаў два шлагбаўмы і толькі ў рове апынуўся, — смяецца Анна Ском'ян, дадаючы падрабязнасці да таго, што сказаў яе муж. — П'яны быў. Ехаў без тармазоў. Ну, але польскі шлагбаўм мусіў пасля адмаляваць.

Сусед, відавочна, кіраваўся на Гродна, якое ў прамой лініі знаходзіцца ў адлегласці дванаццаці кіламетраў ад Хварасцянаў. Едучы праз памежны пераход у Кузніцы, гэта будзе каля трыццаці. Можа таму, каб жыхары Хварасцянаў і навакольных вёсак не наганялі дарэмна дарогі, улады абедзвюх краін у 2003 годзе пачалі размовы аб будове памежнага перахода Хварасцяны — Дубніца. Але хіба што толькі пачалі. Пасля сустрэчы Польска-беларускай міжурадавай камісіі па справах транспамежнага супрацоўніцтва ў Камянцы на Берасцейшчыне польскі бок абавязаўся выступіць да беларускага з нотай аб стварэнні памежных пераходаў Хварасцяны — Дубніца і Ліпшчаны — Сафіёва. Ад гэтага часу ў снежні будзе 8 гадоў.

— Верагодна, што ёсць ужо планы пабудовы памежнага перахода ў ваяводскай управе ў Беластоку. Я асабіста нічога аб іх не ведаю, але папярэдні войт гаварыў, што гэтыя планы бачыў, — кажа сакратар Навадворскай гміны Станіслаў Грынкевіч, раскладваючы розныя дакументы. — Мы пісалі да тагачаснага маршалка Сейма, а цяперашняга прэзідэнта Польшчы Браніслава Камароўскага ў гэтай справе. Таксама інфармавалі аб патрэбе пабудовы памежнага перахода сенатара Владзімежа Цімашэвіча.

— Цікава, калі яны гэта зробяць. Планы!? Тут не зробяць нічога, таму што Лукашэнка не захоча! — абурацца Станіслаў Рэдуха з Новага Двара, які памятае часы, калі людзі пяшком хадзілі па справах у Гродна. — Там на, Беларусі, „Карту паляка" маюць, прыязджаюць да нас. А чаму мы не можам? Казалі, што зробяць у нас 50-кіламетравую зону, што будзем маглі ездзіць на адной візе ўвесь год. Калі ў мяне віза, магу паехаць у Гродна, нешта купіць, пайсці ў архіў, у касцёл ці царкву. Але перш за ўсё трэба, каб пераход тут быў.

У пісьмах да маршалка ці ваяводы можна прачытаць аргументы ў карысць пабудовы перахода, між іншым, што дарога Гродна — Асавец абыходзіць галоўныя мясцовасці на гэтым шляху і не вядзе па тэрыторыях запаведнікаў ды іншых натуральных каштоўнасцей. Іншая рэч што мяжа, усталяваная пасля вайны, падзяліла таксама многія сем'і. Амаль кожны мае кагосьці ў вёсках зараз за мяжою ці ў Гродне.

— Пераход дапамог бы таксама ў падтрымцы зносін між блізкімі асобамі, якія засталіся па абодвух баках мяжы, — дадае Станіслаў Грынкевіч.

Месца, дзе ў будучыні мае быць пабудаваны пераход, знаходзіцца каля двухсот метраў ад канца Хварасцянаў. Тут да 2004 года жыхары абодвух бакоў мелі магчымасць прайсці мяжу на Вялікдзень і Дзяды.

— Тры разы мы хадзілі там да сям'і і на Усіх Святых. Тут зараз за мяжою ёсць могілкі, — гаворыць солтыс Хварасцянаў Януш Тамашэўскі.

— Мяжу ў Хварасцянах адкрывалі таксама ў час канікулаў. Я сам тры разы ездзіў на веласіпедзе ў Гродна. Калі Польшча далучылася да Еўрапейскага саюза, з гэтай пары пешаходны пераход у гэтым месцы застаецца закрытым, — адзначае сакратар Грынкевіч. — Калі паўстане тут пераход, эканамічныя карысці ад гэтага несумненна былі б. Скажам, Дуброва, якая калісьці эканамічна цвіла, цяпер перажывае застой. Няма ніводнага большага прадпрыемства. Толькі ўстановы. А ўстановы не прыносяць гміне падаткаў. Такая ж сітуацыя і ў Новым Двары.

— Дабра вялікага ад гэтага не будзе, але моладзь можа хутчэй якую-небудзь працу знойдзе, — кажа солтыс Януш Тамашэўскі. — Паглядзі, як там на захадзе ёсць. Блізка мяжы крамы парабілі, прыходзяць адны да другіх. Адзін купіць тое, другі нешта іншае. А ў нас што? Зрабілі сцяну і канец, не пойдзеш ні туды, ні сюды!

ISSN 0546-1960